# МЕДЫЯ Ў БЕЛАРУСІ 2020

- РЫНАК
- ЗАКОНЫ
- ІНФАРМАЦЫЙНАЯ БЯСПЕКА

# Змест


**УВОДЗІНЫ 4**

**МЕДЫЯЛАНДШАФТ БЕЛАРУСІ 6**

Вяшчальныя медыя 7

Друкаваныя медыя 13

Інтэрнэт-медыя 16

Рынак медыйнай рэкламы 20

Выкананне стандартаў журналістыкі ў медыя 22

Асноўныя трэнды і галоўныя выклікі для навінавых медыя Беларусі 23

**ЗАКАНАДАЎСТВА АБ МЕДЫЯ І ПРАКТЫКА ЯГО ПРЫМЯНЕННЯ 26**

Закон Рэспублікі Беларусь «Аб сродках масавай інфармацыі» 28

Нормы, якія перашкаджаюць выхаду на рынак новых медыя 29

Нормы, якія абмяжоўваюць права журналістаў і медыя на атрыманне і распаўсюджванне інфармацыі 31

Магчымасці ўжывання санкцый да медыя 35

Рэгуляванне дзейнасці анлайн-медыя 36

Крымінальнае заканадаўства аб дыфамацыі 41

Выкарыстанне заканадаўства аб супрацьдзеянні экстрэмізму для ціску на медыя, журналістаў і блогераў 43

Заканадаўства аб медыя і практыка яго прымянення: рэкамендацыі 45

**ІНФАРМАЦЫЙНАЯ БЯСПЕКА БЕЛАРУСІ Ў МЕДЫЙНАЙ СФЕРЫ 48**

Прарасійская прапаганда на беларускім тэлебачанні 50

Змены ў антыбеларускай дэзынфармацыі і прапагандзе 51

Дзеянні ўладаў па абароне інфармацыйнай прасторы Беларусі 52

Першачарговыя меры па абароне інфармацыйнай прасторы Беларусі ў медыйнай сферы. Рэкамендацыі 54

Ініцыятыва па лакалізацыі глабальных інтэрнэт-сэрвісаў 55

**СПАСЫЛКІ 58**

# УВОДЗІНЫ

Гэты аналітычны даклад прысвечаны медыясферы Беларусі і разглядае розныя аспекты яе развіцця. Аўтары даклада падзяляюць перакананне ў тым, што свабода выказвання меркаванняў у цэлым і свабода прэсы ў прыватнасці з'яўляюцца фундаментальнымі асновамі развіцця дэмакратычнага грамадства і гарантыяй выканання многіх іншых правоў і свабод.

У лютым 2014 года аўтары прадставілі свой папярэдні аналітычны даклад «За рэформы медыя ў Беларусі»[1], які стаў вынікам супрацоўніцтва арганізацыі «Індэкс цэнзуры» (Index on Censorship, Вялікабрытанія) і грамадскага аб'яднання «Беларуская асацыяцыя журналістаў» (БАЖ). У ім быў праведзены аналіз медыяландшафту краіны, заканадаўчай базы, якая ўплывае на свабоду медыя, і практыкі яе прымянення. Вынікам аналізу стала прапанова шэрагу рэкамендацый па ўдасканаленні законаў Беларусі і практыкі іх прымянення для паляпшэння сітуацыі са свабодай медыя ў краіне.

Гэты дакумент абапіраецца на даклад 2014 года як на пэўны зыходны пункт у аналізе сітуацыі ў медыясферы Беларусі. У новым дакладзе аўтары аналізуюць сучасны стан медыяландшафту краіны, змены ў структуры медыяспажывання; ацэньваюць змены ў заканадаўстве, якое ўплывае на медыя, і практыках яго прымянення. Новы раздзел даклада разглядае пытанні інфармацыйнай бяспекі Беларусі і ўплыву расійскіх медыя і прапаганды на сітуацыю ў краіне.

У Канстытуцыі Беларусі замацаваныя гарантыі свабоды выказвання меркавання і атрымання, захоўвання і распаўсюджвання інфармацыі, а таксама забароненая цэнзура.

Нягледзячы на гэта, заканадаўчыя акты, прынятыя ў краіне, а таксама практыка іх прымянення абмяжоўваюць свабоду медыя.

Дзяржава, усталяваўшы кантроль над традыцыйнымі медыя, распаўсюджвае яго на інтэрнэт, а таксама на кнігавыданне і распаўсюджванне кніг.

Беларусь застаецца «несвабоднай» краінай у рэйтынгу «Свабода ў свеце» арганізацыі Freedom House[2]. Ні адны з выбараў ці нацыянальных рэферэндумаў, праведзеных у краіне пасля 1994 года, не былі прызнаныя назіральнікамі БДІПЧ АБСЕ сумленнымі і свабоднымі. Арганізацыя «Рэпарцёры без межаў» па выніках 2019 года змясціла Беларусь на 153-е месца ў свеце са 180 краін па ўзроўні свабоды прэсы[3]. На праблемы ў галіне свабоды выказвання меркаванняў і свабоды прэсы рэгулярна звяртаюць увагу спецыяльны дакладчык ААН па правах чалавека ў Беларусі[4], прадстаўнік АБСЕ па свабодзе медыя[5], міжнародныя журналісцкія і праваабарончыя арганізацыі, прадстаўнікі грамадзянскай супольнасці.

Разам з тым у Беларусі актыўна развіваюцца новыя тэлекамунікацыйныя тэхналогіі, расце хуткасць (і падае кошт) інтэрнэт-падключэнняў, актыўна развіваецца мабільная сувязь. Новыя лічбавыя медыя ўжо сталі рэальнасцю, замяняючы сабой традыцыйныя сродкі масавай інфармацыі. Новая медыйная рэальнасць нясе з сабой новыя магчымасці – і новыя выклікі для свабоды СМІ.

Гэты даклад аналізуе сучасны стан медыясферы Беларусі і прапануе рэкамендацыі для паляпшэння сітуацыі са свабодай медыя ў краіне. Ён быў падрыхтаваны на аснове аналізу дадзеных розных даследаванняў, а таксама інтэрв'ю з вядучымі экспертамі ў галіне медыя ў Беларусі.

# МЕДЫЯЛАНДШАФТ БЕЛАРУСІ

Сучасны медыяландшафт Беларусі пачаў фармавацца з набыццём краінай незалежнасці ў пачатку 1990-х. Пры гэтым у краіне так і не адбыліся працэсы раздзяржаўлення і прыватызацыі медыя. Дзяржава захоўвае кантроль за сферай традыцыйных медыя, пры гэтым спрабуючы пашырыць яго і на інтэрнэт.

Тэлебачанне застаецца галоўнай крыніцай інфармацыі для жыхароў Беларусі. Пры гэтым у краіне няма ні аднаго грамадскага тэлерадыёвяшчальніка. Дзяржава кантралюе найбуйнейшыя вяшчальныя медыя, якія атрымліваюць значныя датацыі з бюджэту. Пры гэтым доля тэлебачання ў структуры медыяспажывання зніжаецца. Падаюць і наклады друкаваных выданняў.

Усё больш ўплыў мае інтэрнэт, пры гэтым пашыраецца выкарыстанне мабільных платформаў і мэсэнджараў. Стабільна высокую папулярнасць сярод жыхароў Беларусі маюць сацыяльныя сеткі. Гэтыя фактары спрыяюць развіццю новых медыя, якія выкарыстоўваюць лічбавыя тэхналогіі, фармаванню новых супольнасцяў вакол блогераў, актывістаў, медыяперсон і медыйных праектаў, не звязаных з традыцыйнымі СМІ, а таксама дыверсіфікацыі каналаў дыстрыбуцыі журналісцкага і іншага кантэнту. Усе гэтыя трэнды робяць сучасны медыяландшафт Беларусі складанай і разнастайнай экасістэмай.

У гэтай частцы аналітычнага даклада падрабязна разглядаецца сітуацыя з асноўнымі тыпамі медыя ў Беларусі, аналізуюцца змены ў структуры медыяспажывання жыхарамі краіны і на рынку медыйнай рэкламы, а таксама асноўныя трэнды і выклікі, якія стаяць перад навінавымі медыя.

## Вяшчальныя медыя

Тэлебачанне застаецца асноўнай крыніцай інфармацыі для жыхароў Беларусі. Гэта пацвярджаюць вынікі некалькіх даследаванняў.

У прыватнасці, паводле дадзеных Інфармацыйна-аналітычнага цэнтра пры Адміністрацыі прэзідэнта Беларусі (ліквідаванага ўказам прэзідэнта краіны ў лютым 2019 года), 72% жыхароў Беларусі ў 2018 годзе называлі тэлебачанне «крыніцай неабходнай інфармацыі пра жыццё ў Беларусі і за мяжой». У 2010 годзе доля такіх беларусаў складала амаль 92%[6]. Зніжэнне ўзроўню спажывання тэлевізійнага кантэнту звязанае з усё больш значнай роляй інтэрнэту як крыніцы інфармацыі.

***Графік 1.*** *Дынаміка адказаў на пытанне «З якіх крыніц вы звычайна атрымліваеце неабходную інфармацыю пра жыццё ў Беларусі і за мяжой?» (у % ад колькасці апытаных).*
***Крыніца:*** *Республика Беларусь в зеркале социологии: сборник материалов социологических исследований, ИАЦ, 2018.*



Найбольшай папулярнасцю тэлебачанне карыстаецца ў прадстаўнікоў старэйшага пакалення. Больш за 88% грамадзян ва ўзросце ад 50 гадоў і старэйшых называюць ТБ асноўнай крыніцай інфармацыі.

Пры гэтым больш за 50% беларусаў ва ўзросце ад 18 да 34 гадоў таксама глядзяць тэлебачанне[7]. Паводле дадзеных розных даследаванняў, наогул не глядзяць тэлебачанне ад 8%[8] да 15%[9] жыхароў краіны.

***Графік 2.*** *Тып медыя ў якасці крыніц інфармацыі для жыхароў Беларусі.*
***Крыніца:*** *Апытанне Open Neighbourhood – Communicating for a stronger partnership: connecting with citizens across the Eastern Neighbourhood. Annual survey report: Belarus.*




Паводле дадзеных Міністэрства інфармацыі, у Беларусі афіцыйна зарэгістраваны 98 тэлепраграм, з якіх 44 – дзяржаўныя і 54 – недзяржаўныя[10]. Пры гэтым усе агульнанацыянальныя тэлеканалы краіны дэ-факта з'яўляюцца дзяржаўнымі.

У структуру Нацыянальнай дзяржаўнай тэлерадыёкампаніі Рэспублікі Беларусь уваходзяць сем нацыянальных тэлеканалаў – «Беларусь 1», «Беларусь 2», «Беларусь 3», «Беларусь 4», «Беларусь 5», «Беларусь 24», «НТВ-Беларусь», а таксама пяць абласных тэлерадыёкампаній, па адной у кожным з рэгіёнаў краіны. Яшчэ тры агульнанацыянальныя каналы знаходзяцца ў структурах кампаній, якія фармальна з'яўляюцца закрытымі

акцыянернымі таварыствамі, але іх заснавальнікамі выступаюць дзяржаўныя кампаніі і/або дзяржаўныя органы. Гэта датычыць тэлеканалаў СТВ і «РТР-Беларусь» (ЗАТ «Сталічнае тэлебачанне»), а таксама ОНТ (ЗАТ «Другі нацыянальны тэлеканал»).

Дзяржаўныя тэлеканалы і радыёстанцыі атрымліваюць буйныя датацыі з бюджэту. Так, расходы рэспубліканскага бюджэту на сродкі масавай інфармацыі на 2020 год запланаваныя ў памеры больш як 164 мільёны рублёў (на момант публікацыі даклада – больш за 73 мільёны долараў ЗША)[11]. З іх больш за 143 мільёны рублёў складуць расходы на тэлебачанне і радыёвяшчанне (на момант публікацыі даклада – амаль 64 мільёны долараў ЗША). Гэта больш за 87% ад агульнага аб'ёму расходаў бюджэту на сродкі масавай інфармацыі.

Беларускамоўны тэлеканал «Белсат», які ўваходзіць у структуру АТ «Польскае тэлебачанне» і вяшчае ў Беларусі праз спадарожнік і інтэрнэт, пазіцыянуе сябе як першае незалежнае тэлебачанне ў краіне. Аднак улады чатыры разы адказвалі адмовай на афіцыйныя просьбы тэлеканала аб акрэдытацыі і адкрыцці карэспандэнцкага пункта ў Беларусі[12]. Акрамя таго, яго карэспандэнты ў Беларусі неаднаразова зазнавалі рэпрэсіі: затрыманні, у тым ліку з прымяненнем сілы, адміністрацыйныя арышты і штрафы. 9 красавіка 2019 года ў мінскім офісе «Белсата» супрацоўнікамі Следчага камітэта быў праведзены вобшук, канфіскавана каля дзесяці носьбітаў інфармацыі, уключаючы камп'ютарную тэхніку[13].

17 чэрвеня 2015 года ў Беларусі быў цалкам завершаны працэс пераходу з аналагавага на лічбавае тэлевізійнае вяшчанне. Пры гэтым у агульнадаступны пакет уваходзіць дзевяць тэлеканалаў: восем беларускіх дзяржаўных і тэлеканал «Мир», створаны пагадненнем кіраўнікоў дзяржаў – удзельніц Садружнасці Незалежных Дзяржаў.

Паводле даследавання ІАЦ, у 2018 годзе самым папулярным сярод беларусаў быў тэлеканал ОНТ – часцей за іншых яго глядзелі амаль 60% рэспандэнтаў.

***Графік 3.*** *Самыя папулярныя тэлеканалы сярод беларускіх гледачоў (глядзелі на працягу месяца перад апытаннем, у % ад колькасці апытаных).*
***Крыніца:*** *Республика Беларусь в зеркале социологии: сборник материалов социологических исследований, ІАЦ, 2018.*




Найбольш папулярнымі фарматамі тэлевізійных перадач сярод жыхароў Беларусі з'яўляюцца серыялы і забаўляльныя праграмы – на іх прыпадае тры чвэрці ўсяго часу тэлеглядзення ў краіне. Згодна з замерамі пачатку 2018 года, усяго 14% тэлеаўдыторыі глядзелі навінавыя і палітычныя праграмы. Прычым падобныя прыхільнасці адзначаюцца ў тэлегледачоў усіх узроставых катэгорый.

Пры гэтым большасць кантэнту, які транслююць дзяржаўныя тэлеканалы, – расійскай вытворчасці. Больш падрабязна пра ўплыў расійскага кантэнту на фарміраванне інфармацыйнага парадку дня ў Беларусі гаворыцца ў раздзеле «Інфармацыйная бяспека Беларусі ў медыйнай сферы» гэтага даклада.

***Графік 4***. *Доля прагляду фарматаў тэлевізійнага кантэнту ў Беларусі (усе гледачы, усе каналы, студзень–красавік 2018 года, % ад агульнага часу прагляду).*
***Крыніца:*** *«АМГ-Кансалт».*




Традыцыйныя тэлеканалы выкарыстоўваюць і новыя лічбавыя платформы для дастаўкі свайго кантэнту да аўдыторыі. Так, тэлеканал ОНТ мае 301.000 падпісчыкаў на сваім канале ў YouTube (дадзеныя на пачатак сакавіка 2020 года). Амаль 300.000 у студзені 2020 года складаў лік рэальных карыстальнікаў з Беларусі сайта Белтэлерадыёкампаніі (tvr.by – інфармацыя Baltic Internet Policy Initiative паводле звестак gemiusAudience). Сайт тэлеканала «Белсат» у студзені 2020 года ўваходзіў у пяцёрку самых папулярных сайтаў навінавых медыя (сярод тых, што былі ў даследаванні) у Беларусі (752.521 карыстальнік ва ўзросце ад 15 да 74 гадоў – інфармацыя Baltic Internet Policy Initiative паводле gemiusAudience).

У лютым 2020 года з'явілася інфармацыя пра планы стварэння новага тэлеканала навін на базе Белтэлерадыёкампаніі. «Мы павінны стварыць мабільны канал накшталт Euronews і іншых, якія вельмі коратка і даступна (тым не менш, і аналітыка ў іх ёсць) выдаюць інфармацыю. Людзі вельмі занятыя, каб слухаць працяглыя, як увечары на БТ ці СТВ, выніковыя перадачы. На працягу дня людзі хочуць атрымаць галоўную інфармацыю», – заявіў прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка на нарадзе з кіраўніцтвам дзяржаўных медыя[14].

Акрамя таго, усё большую папулярнасць у Беларусі атрымлівае інтэрактыўнае тэлебачанне (IPTV і Smart TV). Паводле ацэнак «АМГ-Кансалта», адзінага заказчыка вымярэнняў аўдыторыі тэлебачання і радыё ў Беларусі, удзельная вага карыстальнікаў інтэрактыўнага ТБ у краіне ў 2019 годзе дасягнула 50%.

Радыё ў Беларусі страчвае аўдыторыю. Так, паводле даследавання ІАЦ, у 2018 годзе менш за 13% рэспандэнтаў назвалі яго ў якасці крыніцы інфармацыі, хоць у 2009-м гэты паказчык быў вышэйшы за 40%.
Пры гэтым, паводле даследавання, дзве траціны жыхароў краіны наогул не слухаюць радыё.

***Графік 5.*** *Самыя папулярныя радыёстанцыі сярод беларускіх слухачоў (слухалі на працягу месяца перад апытаннем, у % ад колькасці апытаных).*
***Крыніца:*** *Республика Беларусь в зеркале социологии: сборник материалов социологических исследований, ІАЦ, 2018.*



Асаблівую папулярнасць мае FM-вяшчанне. Станцыі, якія вяшчаюць у гэтым дыяпазоне, уваходзяць у лік самых папулярных у краіне. Паводле дадзеных Міністэрства інфармацыі, у Беларусі зарэгістраваныя 167 радыёпраграм, пераважная большасць з якіх (140, або 84% ад агульнай колькасці) з'яўляюцца дзяржаўнымі.

Размеркаваннем радыёчастот для вяшчання займаецца спецыяльная дзяржаўная камісія пры Савеце бяспекі Рэспублікі Беларусь. У яе склад уваходзяць выключна службовыя асобы дзяржаўных органаў, у тым ліку праваахоўных, спецслужбаў і Узброеных сіл, а таксама шэрагу міністэрстваў і ведамстваў.

Дзяржаўную манаполію на вяшчанне некалькі парушаюць замежныя станцыі: «Радыё Свабода», «Еўрапейскае радыё для Беларусі», «Радыё Рацыя». Іх перадачы арыентаваныя на беларускую аўдыторыю і рыхтуюцца пераважна беларускімі журналістамі.

Аднак «Радыё Свабода» спыніла эфірнае вяшчанне 30 красавіка 2019 года, пераключыўшыся выключна на распаўсюджванне кантэнту ў інтэрнэце[15]. «Еўрапейскае радыё для Беларусі» мае магчымасць вяшчаць у FM-дыяпазоне толькі ў некаторых раёнах Гродзенскай і Брэсцкай абласцей, а ў астатнім вяшчае таксама ў інтэрнэце і праз спадарожнік.

## Друкаваныя медыя

Лік друкаваных медыя і іх агульны наклад у Беларусі няўхільна зніжаюцца. Гэта відаць з дадзеных дзяржаўнай статыстыкі.

Паводле дадзеных Міністэрства інфармацыі, на 1 сакавіка 2020 года ў Беларусі былі афіцыйна зарэгістраваныя 722 газеты і 864 часопісы.

27% усіх зарэгістраваных друкаваных сродкаў масавай інфармацыі маюць дзяржаўную форму ўласнасці.

***Графік 6.*** *Колькасць газет і іх агульны наклад у мільёнах асобнікаў у Беларусі.*

***Крыніца:*** *Белстат.*




Аднак пераважная большасць прыватных друкаваных медыя носіць забаўляльны ці рэкламны характар. Паводле звестак Беларускай асацыяцыі журналістаў, у краіне налічваецца не больш за тры дзясяткі недзяржаўных грамадска-палітычных газет, большасць з якіх выдаюцца ў рэгіёнах. У прыватнасці, выданні, аб'яднаныя 13 брэндамі, якія ўваходзяць у Асацыяцыю выдаўцоў рэгіянальнай прэсы «Аб'яднаныя Масмедыя», маюць агульны наклад каля 100.000 асобнікаў[16].

На сітуацыю на рынку друкаваных выданняў Беларусі маюць уплыў як глабальныя трэнды скарачэння накладу газет, так і асаблівасці рэгулявання рынку з боку дзяржавы. Сістэма дзяржаўнай рэгістрацыі друкаваных выданняў доўгі час выклікала мноства нараканняў з боку выдаўцоў грамадска-палітычнай прэсы і незалежных экспертаў. Сур'ёзны ўдар па рынку быў нанесены напярэдадні прэзідэнцкіх выбараў – 2006, калі як мінімум 16 незалежных газет былі выключаныя з падпісных каталогаў «Белпошты», а з 19 былі скасаваныя дамовы прадпрыемствам «Белсаюздрук». Многія з тых газет вымушаныя былі спыніць выданне ў сувязі з немагчымасцю распаўсюджвацца сярод чытачоў.

На час падрыхтоўкі папярэдняга даклада «За рэформы медыя ў Беларусі» (2014) як мінімум 11 недзяржаўных друкаваных выданняў сутыкаліся з абмежаваннямі ў распаўсюджванні праз дзяржаўныя сістэмы «Белсаюздрук» і/ці «Белпошта».

Праблема была вырашаная ў 2017 годзе, і на момант падрыхтоўкі гэтага даклада такіх выпадкаў не зафіксавана[17].

Згодна з даследаваннем ІАЦ, самымі папулярнымі друкаванымі выданнямі ў 2018 годзе былі газета Адміністрацыі прэзідэнта Беларусі «Советская Белоруссия» («СБ.Беларусь сегодня»), а таксама «Комсомольская правда» в Белоруссии» і «Аргументы и факты в Белоруссии».

***Графік 7.*** *Самыя папулярныя газеты сярод беларускіх чытачоў (чыталі на працягу месяца перад апытаннем, у % ад колькасці апытаных), 2018 год.*
***Крыніца:*** *Республика Беларусь в зеркале социологии: сборник материалов социологических исследований, ІАЦ, 2018.*




На фоне зніжэння накладаў шэраг друкаваных выданняў паспяхова пераходзіць на лічбавыя платформы. Так, у дзясятцы самых папулярных сайтаў медыя сярод жыхароў Беларусі, паводле дадзеных gemiusAudience за снежань 2019 года, былі тры выданні, у якіх ёсць друкаваная версія: «Комсомольская правда» в Белоруссии» (kp.by), «СБ.Беларусь сегодня» (sb.by) і Intex-Press (Баранавічы, intex-press.by).

# Інтэрнэт-медыя

Інтэрнэт робіцца ўсё больш распаўсюджанай крыніцай атрымання інфармацыі для жыхароў Беларусі – такой, паводле дадзеных прыведзеных вышэй апытанняў, называюць яго ад 60% да 74% беларусаў.

Паводле дадзеных афіцыйнай статыстыкі, у 2018 годзе 79% насельніцтва Беларусі ва ўзросце ад 6 да 72 гадоў (прыкладна 7,5 млн чалавек) карысталіся інтэрнэтам, прычым 62,6% уваходзілі ў сетку штодня[18].

Паводле дадзеных даследавання gemiusAudience, у студзені 2020 года ў Беларусі налічвалася 5.364.845 карыстальнікаў інтэрнэту ва ўзросце ад 15 да 74 гадоў. 4.270.995 з іх выходзілі ў сетку са стацыянарных камп'ютараў; 4.571.287 рабілі гэта з мабільных прылад, у асноўным з тэлефонаў.

У лік самых папулярных сярод жыхароў Беларусі сайтаў уваходзяць глабальныя інтэрнэт-рэсурсы (Google, YouTube, Wikipedia, AliExpress), буйныя расійскія сацыяльныя сеткі і парталы («ВКонтакте», «Одноклассники», Yandex, Mail.ru), а таксама беларускія праекты ( TUT.by, Onliner, Kufar.by і іншыя).

***Табліца 8.*** *20 самых наведвальных сайтаў у Беларусі па сярэднямесячным трафіку згодна з дадзенымі сайта alexa.com.*
***Крыніца:*** *даклад Digital 2020: Belarus, We Are Social, Hootsuite.*

| # | Назва сайта | # | Назва сайта |
|---|---|---|---|
| 1 | google.com | 11 | kufar.by |
| 2 | youtube.com | 12 | asb.by |
| 3 | vk.com | 13 | google.by |
| 4 | tut.by | 14 | aliexpress.com |
| 5 | ok.ru | 15 | yandex.ru |
| 6 | mail.ru | 16 | av.by |
| 7 | yandex.by | 17 | schools.by |
| 8 | onliner.by | 18 | seasonvar.ru |
| 9 | wikipedia.org | 19 | wildberries.by |
| 10 | kinogo.by | 20 | 21vek.by |

У спісе самых наведвальных у Беларусі навінавых рэсурсаў у асноўным прысутнічаюць недзяржаўныя анлайн-медыя, хоць сярод лідараў у гэтай катэгорыі ёсць таксама сайт дзяржаўнага інфармацыйнага агенцтва БелТА. Высокія пазіцыі ў рэйтынгу на пачатак 2020 года займалі і сайты рэгіянальных недзяржаўных медыя, напрыклад, ex-press.by (Барысаў), intex-press.by (Баранавічы), gomel.today (Гомель).

***Табліца 9.*** *10 самых наведвальных навінавых сайтаў (сярод аўдыраваных) і колькасць наведвальнікаў (real users) з Беларусі ў студзені 2020 года.* ***Крыніца:*** *Baltic Internet Policy Initiative паводле дадзеных gemiusAudience.*

| Сайт | Real Users | Сайт | Real Users |
|---|---|---|---|
| tut.by (навіны) | 2 986 190 | citydog.by | 619 013 |
| naviny.by | 1 420 609 | obozrevatel.com | 577 171 |
| kp.by | 1 049 786 | mail.ru (навіны) | 573 343 |
| belta.by | 758 436 | the-village.me | 488 316 |
| belsat.eu | 752 521 | aif.by | 477 076 |

Сацыяльныя сеткі ўваходзяць у лік самых папулярных сайтаў сярод карыстальнікаў з Беларусі. Як відаць з прыведзенага вышэй рэйтыянгу (табліца 8), сацсеткі «ВКонтакте» і «Одноклассники» ўваходзяць у пяцёрку самых папулярных сайтаў у жыхароў краіны. Паводле ацэнкі аўтараў даклада Digital 2020: Belarus, сацсеткамі карыстаюцца 3,9 млн жыхароў краіны.

Прыкладны лік акаўнтаў, зарэгістраваных як беларускія, можна ацаніць пры спробе таргетаваць рэкламныя аб'явы ў некаторых з сацсетак. Дадзеную ацэнку аўтары даклада правялі ў канцы лютага 2020 года.

***Табліца 10.*** *Прыкладная колькасць акаўнтаў з Беларусі ў сацыяльных сетках, люты 2020 года.*



Падобныя дадзеныя атрымалі і аўтары даследавання «Сацыяльныя сеткі ў Беларусі», якія ацанілі колькасць аўтараў і іх актыўнасць у розных сацсетках на працягу аднаго месяца, у кастрычніку 2019 года[19].

***Графік 11.*** *Колькасць паведамленняў і аўтараў з Беларусі ў розных сацыяльных сетках за кастрычнік 2019 года.*
***Крыніца:*** *Brand Analytics.*




Аўтары справаздачы Digital 2020 адзначаюць, што 92% карыстальнікаў сацыяльных сетак у Беларусі заходзяць у іх з мабільных прылад. Буйныя медыяпляцоўкі таксама адзначаюць, што доля мабільнага трафіку на іх дасягае 70-80%. У цэлым жа, паводле ацэнак удзельнікаў рынку, каля 60% трафіку ў Беларусі прыпадае на мабільныя прылады. Гэта звязана з распаўсюджваннем і развіццём тэхналогій мабільнай сувязі. У прыватнасці, мабільная сувязь чацвёртага пакалення (4G) даступная ва ўсіх буйных населеных пунктах краіны.

Агульная колькасць мабільных карыстальнікаў на студзень 2020 года ў Беларусі складала 11,93 мільёна. Больш за 85% з іх выкарыстоўваюць мабільныя прылады на базе аперацыйнай сістэмы Android[20]. Развіццё мабільнага інтэрнэту робіць усё больш папулярнымі сярод беларусаў і мэсэнджары. Паводле даследавання кампаніі #DB3 на замову Baltic Internet Policy Initiative, у 2019 годзе самым папулярным з іх з'яўляецца Viber[21].

***Графік 12**. Вынікі апытання «Якімі мэсэнджарамі вы карыстаецеся?», выбарка з 662 жыхароў Беларусі ва ўзросце 15–74 гады, жнівень 2019 года.*
***Крыніца:** #DB3.*




Адзін з медыяэкспертаў, з якімі аўтары гэтага даклада размаўлялі ў межах яго падрыхтоўкі, назваў 2019 год у медыясферы Беларусі «годам Telegram». Telegram-каналы, частка якіх з'яўляюцца ананімнымі, набываюць усё большую папулярнасць і ўсё часцей робяцца крыніцамі інфармацыі і для карыстальнікаў, і для журналістаў традыцыйных і анлайн-медыя. У іх публікуюцца меркаванні, часцяком вострыя, і розны кантэнт – навіны, аналітыка, сатыра, – які тычыцца як палітычнага жыцця краіны, так і іншых сфер. Telegram-каналы робяцца важнымі платформамі для дасягнення новых аўдыторый для медыя, лідараў думкі, а таксама дзяржаўных органаў. У прыватнасці, даволі папулярнымі да пачатку 2020 года сталі Telegram-каналы «Пул Першага» (яго звязваюць з прэс-службай прэзідэнта Лукашэнкі) і «Прэс-сакратар МУС».

Уплыў Telegram-каналаў на інфармацыйнае поле краіны падкрэсліў нават прэзідэнт Лукашэнка.

Падчас нарады з кіраўнікамі найбуйнейшых дзяржаўных медыя ў лютым 2020 года ён зазначыў: «Telegram-каналы, блогі, сацыяльныя сеткі па ўплыве як мінімум зраўнаваліся з традыцыйнымі СМІ. Моладзь у асноўным там. Мабільны тэлефон з выхадам у інтэрнэт у распараджэнні ўсіх жадаючых ад дзіцяці да састарэлага чалавека. І гэтыя матэрыялы ім даступныя ў любы час сутак»[22].

У пачатку 2020 года Telegram-канал вядомага палітычнага блогера NEXTA стаў першым сярод беларускіх каналаў, які дасягнуў 200 тысяч падпісчыкаў[23].

## Рынак медыйнай рэкламы

Традыцыйная бізнес-мадэль медыя прадугледжвае дзве асноўныя крыніцы даходу: гэта продаж кантэнту аўдыторыі ў розных формах (падпіска) і продаж увагі аўдыторыі рэкламадаўцам. Даходы ад рэкламы з'яўляюцца важным фактарам развіцця медыярынку.



Агульны аб'ём рынку медыйнай рэкламы Беларусі ў 2019 годзе ацэньваўся ў 115 мільёнаў долараў ЗША. Прагнозы на 2020 год прадугледжваюць далейшы рост аб'ёму рынку да 126 мільёнаў долараў ЗША.

Інтэрнэт стаў галоўным каналам на рэкламным рынку, абагнаўшы ў 2019 годзе па долі тэлебачанне. У 2017 годзе рынак інтэрнэт-рэкламы Беларусі заняў першае месца ў Еўропе па тэмпах росту, а па выніках 2018 года таксама ўваходзіў у тройку рынкаў з найбольш хуткім ростам (прыкладна 23%). Пры гэтым па агульным аб'ёме рынку інтэрнэт-рэкламы Беларусь дагэтуль займае адно з апошніх месцаў у Еўропе[24].

Адной з найважнейшых падзей на рынку медыйнай рэкламы Беларусі эксперты называюць стварэнне новага, дэ-факта дзяржаўнага, сэйлз-хаўза. У верасні 2019 года было абвешчана аб тым, што Белтэлерадыёкампанія, ЗАТ «Другі нацыянальны тэлеканал», ЗАТ «Сталічнае тэлебачанне» і прадстаўніцтва тэлерадыёкампаніі «Мир» на парытэтнай аснове стварылі

ТАА «Тэлевізійны рэкламны альянс» – прадпрыемства, якое з 1 студзеня 2020 года займаецца продажам рэкламнага часу ў эфіры гэтых тэлекампаній[25]. Гэта з'яўляецца сур'ёзным перадзелам рынку, які ацэньваецца ў 44 мільёны долараў за год.

***Графік 13.*** *Дынаміка рэкламнага рынку Беларусі, у мільёнах долараў ЗША за год.*

***Крыніца:*** *Vondel.*



## Выкананне стандартаў журналістыкі ў медыя

У рамках даклада «За рэформы медыя ў Беларусі», падрыхтаванага ў 2014 годзе, было праведзенае даследаванне, якое паказала істотныя адрозненні ў рэдакцыйных палітыках навінавых медыя розных формаў уласнасці, уключаючы падбор тэмаў і падыходы да іх асвятлення. У прыватнасці, адзначалася, што рэдакцыі недзяржаўных медыя маюць значна больш збалансаваны падыход да асвятлення падзей як унутры краіны, так і за мяжой, у той час як дзяржаўныя медыя часцяком выступаюць у якасці платформаў для прапаганды поглядаў і дзеянняў кіраўніцтва краіны.

Дадзеныя, атрыманыя іншым незалежным маніторынгам у 2019 годзе, праз пяць гадоў, пацвярджаюць тыя ж тэндэнцыі. Маніторынг Media IQ, які праводзіў «Прэс-клуб Беларусь» з лютага па снежань 2019 года, зафіксаваў парушэнні стандартаў пэўнасці і аддзялення меркаванняў ад фактаў у працы тэлеканалаў, у першую чаргу дзяржаўных.

«У Беларусі (як у многіх постсавецкіх краінах) журналістыка фактаў пакуль не з'яўляецца агульнапрынятай практыкай. Часткова гэта абумоўлена гістарычнымі перадумовамі: на працягу доўгага перыяду сродкі масавай інфармацыі і прапаганды абслугоўвалі савецкую ўладу. І сёння медыя (асабліва тыя, што фінансуюцца з рэспубліканскага бюджэту) працягваюць працаваць па ранейшых лякалах, падаючы аўдыторыі амаль савецкія наратывы пра «клапатлівую» ўладу, няздатны да самастойнасці народ, а таксама прасоўваючы патрэбны ўладам парадак дня і фокусы яго ўспрымання», – гаворыцца ў выніковым дакладзе маніторынгу[26].

Маніторынг Media IQ зафіксаваў стандартныя алгарытмы працы дзяржаўных медыя ў перыяд значных грамадска-палітычных падзей: «Рэдакцыі заміраюць у рэжыме чакання, а затым выпускаюць ідэнтычныя матэрыялы на аснове тэкстаў, выверанах або пададзеных ідэолагамі ад улады, што сведчыць аб прасоўванні пэўнай праблематыкі. Як варыянт, падзея замоўчваецца альбо хаваецца пад патрэбнымі трактоўкамі або ў інфармацыйным шуме». Пры гэтым аўтары маніторынгу адзначаюць, што маніпуляцыі таксама сустракаюцца і ў недзяржаўных медыя.

***Графік 14**. Доля навінавых матэрыялаў з парушэннямі стандартаў журналістыкі.*

***Крыніца:** маніторынг Media IQ, «Прэс-клуб Беларусь».*




## Асноўныя трэнды і галоўныя выклікі для навінавых медыя Беларусі



Беларускія медыяэксперты, з якімі былі праведзеныя інтэрв'ю ў рамках падрыхтоўкі гэтага даклада, адзначылі асноўныя трэнды на рынку навінавых медыя краіны:

- значны рост анлайн-аўдыторый навінавых медыя і дыверсіфікацыя каналаў распаўсюджвання кантэнту, уключаючы сацыяльныя сеткі, мэсэнджары і рэкамендацыйныя сэрвісы (у першую чаргу Yandex Zen);
- з'яўленне і развіццё новых медыйных праектаў, у тым ліку мясцовых, лакальных і гіперлакальных, якія маюць цесную сувязь са сваімі аўдыторыямі;
- усё больш медыйных праектаў абапіраюцца на падтрымку, уключаючы фінансавую, мясцовых супольнасцяў і бізнесу, у тым ліку буйнога, а не замежных донараў. Гэта звязана як з ростам аб'ёму рэкламнага рынку, так і з усё большым распаўсюджваннем інтэрнэту, у тым ліку ў рэгіёнах краіны.

Асноўныя выклікі, якія стаяць перад рэдакцыямі навінавых медыя ў Беларусі:

- **Дасягненне фінансавай устойлівасці.** Дзяржаўныя медыя працягваюць карыстацца прамымі датацыямі з бюджэту і іншымі адміністрацыйнымі прэферэнцыямі. Сярод недзяржаўных медыя фінансавай устойлівасці дасягаюць альбо буйныя гульцы, якія маюць дастаткова рэсурсаў для захопу значнай часткі рынкаў аўдыторыі і рэкламы, альбо нішавыя выданні, альбо кампаніі, якія здолелі дыверсіфікаваць крыніцы даходаў, у тым ліку зарабляць на сэрвісах, адрозных ад толькі вытворчасці і распаўсюджвання кантэнту. Многія сярэднія і дробныя гульцы рынку, асабліва сярод медыя з друкаванай версіяй, усё яшчэ спрабуюць знайсці новую эфектыўную бізнес-мадэль у зменлівых умовах.

- **Вырашэнне праблемы недахопу кадраў.** Прычым не толькі журналісцкіх – у шматлікіх рэдакцыях назіраецца востры недахоп спецыялістаў у галіне кіравання, менеджменту, продажу, дастаўкі кантэнту на лічбавых платформах. Доўгія гады ў камандах медыя назіраўся сур'ёзны колькасны перакос на карысць вытворцаў кантэнту. Змена структуры медыяспажывання, рынку рэкламы і, такім чынам, трансфармацыя бізнес-мадэлі навінавых медыя патрабуе новых кампетэнцый ад іх персаналу. Многія рэдактары адзначаюць у якасці праблемы маленькія рэдакцыйныя калектывы, члены якіх часта сутыкаюцца з прафесійным выгараннем іператамленнем ад вялікага аб'ёму працы.

- **Павышэнне якасці кантэнту і абарона аўтарскіх правоў.** Вытворцы якаснага журналісцкага кантэнту сутыкаюцца з праблемай яго запазычання сайтамі-агрэгатарамі і групамі ў сацыяльных сетках. Для таго каб вытрымліваць канкурэнцыю, неабходна выпрацоўваць больш кантэнту і рабіць гэта хутчэй – ад чаго церпіць яго якасць. Неабходныя меры па абароне правоў вытворцаў кантэнту, а таксама інвестыцыі ў «сур'ёзныя» жанры журналістыкі, такія як расследаванне, аналітыка, і стварэнне мультымедыйнага кантэнту для розных платформаў.

- **Неабходнасць развіцця рынку даследаванняў медыя.** Невялікі аб'ём медыйнага рынку Беларусі не дае магчымасці праводзіць дастатковую колькасць даследаванняў розных яго сегментаў і рабіць гэта з патрэбнай перыядычнасцю і стабільнасцю. З-за таго што структура медыяспажывання ўвесь час мяняецца, з'яўляюцца новыя тэхналогіі і платформы, даследаванні аўдыторыі медыя робяцца ўсё больш складанымі і дарагімі. Адсутнасць ці дарагоўля доступу да звестак абцяжарвае глыбокае вывучэнне медыя сваіх аўдыторый.

# ЗАКАНАДАЎСТВА АБ МЕДЫЯ І ПРАКТЫКА ЯГО ПРЫМЯНЕННЯ

З моманту падрыхтоўкі папярэдняга даклада «За рэформы медыя ў Беларусі» (люты 2014 года) у беларускае заканадаўства аб сродках масавай інфармацыі былі ўнесеныя істотныя змены і дапаўненні. Большай часткай гэтыя змены апынуліся прама супрацьлеглымі рэкамендацыям аўтараў даклада і экспертаў. Змянілася і правапрымяняльная практыка.

Сярод станоўчых змен можна вылучыць наступныя:

- рэгістрацыя інтэрнэт-выданняў у якасці СМІ не стала абавязковай;
- уладальнікі інтэрнэт-рэсурсаў атрымалі права судовага аспрэчвання абмежавання доступу да іх сайтаў;
- недзяржаўныя друкаваныя СМІ пасля 11 гадоў дыскрымінацыі былі вернутыя ў дзяржаўныя сістэмы распаўсюджвання па падпісцы і ў розніцу;
- Міністэрства інфармацыі і пракуратура на працягу гэтага перыяду не выкарыстоўвалі свае паўнамоцтвы па прыпыненні або спыненні выпуску зарэгістраваных сродкаў масавай інфармацыі.

Аднак большасць зменаў у заканадаўства ў сферы свабоды выказвання меркавання за апошнія гады былі накіраваныя на абмежаванне гэтай свабоды і ўзмацненне дзяржаўнага кантролю над інфармацыйнай прасторай краіны.

1. Уведзеная законам, хай і добраахвотная, рэгістрацыя інтэрнэт-выданняў у якасці СМІ ажыццяўляецца ў дазвольным, ускладненым і дарагім парадку.

2. Інтэрнэт-выданні, не зарэгістраваныя ў якасці СМІ, не атрымліваюць правоў СМІ, а іх супрацоўнікі не атрымліваюць правоў журналістаў. Пры гэтым на іх распаўсюджваюцца ўсе абавязкі, прадугледжаныя Законам аб СМІ, і санкцыйныя паўнамоцтвы дзяржаўных органаў.

3. Абмежаванне доступу да інтэрнэт-выданняў ажыццяўляецца ў пазасудовым парадку; працэдура і падставы абмежавання доступу застаюцца непразрыстымі.

4. Уведзеная абавязковая ідэнтыфікацыя каментатараў на сайтах і форумах; інтэрнэт-рэсурсы нясуць адказнасць за каментары, размешчаныя на іх старонках трэцімі асобамі. На практыцы гэта цягне за сабой прэмадэрацыю каментароў альбо поўную адмову рэдакцыямі інтэрнэт-рэсурсаў ад каментароў карыстальнікаў.

5. З 2014 года суды на падставе пратаколаў супрацоўнікаў міліцыі прыцягваюць да адказнасці журналістаў-фрылансараў, якія супрацоўнічаюць з замежнымі медыя без акрэдытацыі, нягледзячы на адсутнасць у КоАП прамога ўказання на такі склад правапарушэння і міжнародныя абавязацельствы Беларусі ў галіне свабоды выказвання меркавання. Журналістаў штрафуюць незалежна ад зместу іх публікацый за сам факт іх з'яўлення ў замежных СМІ (у першую чаргу, на тэлеканале «Белсат» і на «Радыё Рацыя»). Паводле звестак Беларускай асацыяцыі журналістаў, з 2014 па 2019 гады было адзначана 279 выпадкаў штрафаў у дачыненні да журналістаў за «незаконнае распаўсюджванне прадукцыі СМІ».

6. Узмацнілася прымяненне антыэкстрэмісцкага заканадаўства супраць СМІ і медыяактывістаў.

Гэтая частка даклада падрабязна разглядае заканадаўства Беларусі, якое рэгулюе дзейнасць медыя ў краіне, а таксама практыку яго прымянення.

## Закон Рэспублікі Беларусь «Аб сродках масавай інфармацыі»

З моманту падрыхтоўкі папярэдняга даклада «За рэформы медыя ў Беларусі» ў Закон Рэспублікі Беларусь «Аб сродках масавай інфармацыі» ад 17 ліпеня 2008 года № 427-З (далей па тэксце – Закон аб СМІ) неаднаразова ўносіліся змены і дапаўненні.

Найбольш істотнымі з іх былі «пакетныя» папраўкі 2014 і 2018 гадоў, якія яшчэ больш узмацнілі строгасць дзяржаўнага рэгулявання медыйнай сферы і дзяржаўны кантроль над інтэрнэт-прасторай у Беларусі.

Палажэнні Закона аб СМІ прадугледжваюць наступнае:

- дазвольны парадак рэгістрацыі сродкаў масавай інфармацыі, у тым ліку друкаваных;
- добраахвотны парадак рэгістрацыі сеткавых СМІ; пры гэтым захоўваецца складаны і шматступеньчаты парадак такой рэгістрацыі, непераадольны для большасці інтэрнэт-рэсурсаў;
- на ўладальнікаў інтэрнэт-рэсурсаў, не зарэгістраваных у якасці сеткавых выданняў, распаўсюджваюцца абавязкі і адказнасць, прадугледжаныя Законам аб СМІ, але пры гэтым ім не надаюцца правы рэдакцый СМІ;
- парадак ліцэнзавання радыёвяшчальных СМІ застаецца непразрыстым;
- распаўсюджвальнікі прадукцыі СМІ павінны праходзіць рэгістрацыю, пры гэтым Міністэрства інфармацыі мае магчымасць забараніць іх дзейнасць;
- інстытут акрэдытацыі выкарыстоўваецца для абмежавання доступу журналістаў да інфармацыі;

- пералік інфармацыі, забароненай да распаўсюджвання ў СМІ, празмерна шырокі і не з'яўляецца вычарпальным;

- уведзеная абавязковая ідэнтыфікацыя каментатараў на сайтах і форумах і мадэрацыя каментароў інтэрнэт-рэсурсамі;

- Міністэрства інфармацыі мае шырокія кантрольныя функцыі, уключаючы магчымасць звароту з іскам аб спыненні дзейнасці СМІ незалежна ад цяжару парушэнняў, дапушчаных СМІ, спрошчаны пазасудовы парадак адклікання Мініфармам ліцэнзіі на вяшчанне, абмежавання доступу да інтэрнэт-рэсурсаў, забароны дзейнасці распаўсюджвальніка прадукцыі СМІ.

Такім чынам, заканадаўства аб СМІ:

- перашкаджае выхаду на медыйны рынак СМІ новых праектаў;
- абмяжоўвае права журналістаў і СМІ на атрыманне і распаўсюджванне інфармацыі;
- усталёўвае шырокія магчымасці прымянення да іх рознага роду санкцый (аж да спынення дзейнасці традыцыйных СМІ або блакіроўкі інтэрнэт-рэсурсаў).





## Нормы, якія перашкаджаюць выхаду на рынак новых медыя

### Рэгістрацыя сродкаў масавай інфармацыі

Фактычна ў Беларусі ўстаноўлены двухступеньчаты дазвольны парадак заснавання СМІ: спачатку трэба зарэгістраваць рэдакцыю ў якасці юрыдычнай асобы, а потым – у якасці сродку масавай інфармацыі.

Рэгістрацыю СМІ ажыццяўляе Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Сярод рэгістрацыйных патрабаванняў – інфармацыя пра рэдакцыю яшчэ не зарэгістраванага СМІ, меркаваная тэрыторыя яго распаўсюджвання, спецыялізацыя (тэматыка) СМІ, крыніцы яго фінансавання, меркаваны

накладдрукаванага СМІ, звесткі пра заснавальнікаў СМІ, дадатковыя патрабаванні да рэдактара (вышэйшая адукацыя і пяцігадовы стаж на кіраўніцкіх пазіцыях у гэтай сферы) і размяшчэння рэдакцыі (толькі ў памяшканнях нежылога фонду). Апошнія два патрабаванні Законам аб СМІ не прадугледжаныя, але ўключаныя Мініфармам у форму заявы аб рэгістрацыі. Рэдакцыя СМІ павінна быць юрыдычнай асобай (індывідуальны прадпрымальнік у гэтай якасці выступаць не можа).

Патрабаванне абавязковай рэгістрацыі не распаўсюджваецца на друкаваныя СМІ, якія выходзяць накладам да 300 асобнікаў, і на шэраг іншых медыя, у тым ліку інтэрнэт-рэсурсы. Аднак яны падпадаюць пад дзеянне іншых нормаў заканадаўства аб СМІ (у тым ліку санкцыйных).

Рэгістрацыя інтэрнэт-рэсурсаў у якасці СМІ («сеткавых выданняў») мае добраахвотны характар, але на яе распаўсюджваюцца тыя ж правілы (акрамя пазнакі накладу і тэрыторыі распаўсюджвання), якія ўстаноўленыя для друкаваных СМІ. Для большасці інтэрнэт-рэсурсаў бар'еры, устаноўленыя для рэгістрацыі ў якасці сеткавага выдання, непераадольныя. Па стане на 1 сакавіка 2020 года, гэта значыць больш чым праз год з моманту ўваходжання ў сілу новых правілаў, толькі 20 інтэрнэт-рэсурсаў афіцыйна зарэгістраваліся ў якасці сеткавых выданняў, з іх 14 дзяржаўных і толькі шэсць недзяржаўных.

**Ліцэнзаванне дзейнасці ў галіне вяшчання**

Выхад на рынак вяшчальных СМІ яшчэ больш ускладнены. Пасля рэгістрацыі юрыдычнай асобы, на якую ўскладзеныя функцыі рэдакцыі СМІ, і рэгістрацыі ўласна сродку масавай інфармацыі (радыё-, тэлепраграмы) патэнцыйнаму вяшчальніку неабходна атрымаць частату вяшчання і спецыяльны дазвол (ліцэнзію) на ажыццяўленне дзейнасці ў галіне вяшчання (арт. 24 Закона аб СМІ). Рашэнні пра выдачу (або адмову ў выдачы) ліцэнзіі, унясенне ў яе зменаў і (або) дапаўненняў, прыпыненне, аднаўленне, працяг тэрміну дзеяння ліцэнзіі, спыненне яе дзеяння,ануляванне ліцэнзіі на вяшчанне прымае калегіяльны орган Міністэрства інфармацыі.

Такім чынам, Міністэрства інфармацыі мае права пазбавіць вяшчальніка ліцэнзіі ў пазасудовым парадку, спасылаючыся на рашэнне калегіі Міністэрства інфармацыі, члены якой не нясуць адказнасці за прынятыя рашэнні; пры гэтым большасць з іх не мае юрыдычнай адукацыі.

Адной з падстаў для пазбаўлення ліцэнзіі з'яўляецца ажыццяўленне ліцэнзіятам «дзейнасці з мэтамі, якія супярэчаць інтарэсам Рэспублікі Беларусь». Гэтая фармулёўка з'яўляецца няпэўнай і некарэктнай з пункту гледжання права.

## Нормы, якія абмяжоўваюць права журналістаў і медыя на атрыманне і распаўсюджванне інфармацыі

**Выкарыстанне інстытута акрэдытацыі карэспандэнтаў СМІ для абмежавання правоў журналістаў**

Азначэнне тэрміна «акрэдытацыя журналіста сродку масавай інфармацыі», дадзенае ў пункце 1 артыкула 1 Закона «Аб сродках масавай інфармацыі», не адпавядае асноватворным прынцыпам свабоды масавай інфармацыі і звязвае магчымасць ажыццяўлення журналісцкай дзейнасці з акрэдытацыяй. Між тым акрэдытацыя заяўляецца не формай дазволу на прафесійную дзейнасць журналіста, а працэдурай прызнання паўнамоцтваў журналістаў тым ці іншым органам (арганізацыяй). Мэта акрэдытацыі – стварэнне найбольш спрыяльных умоў для працы журналістаў, якія яе атрымалі.

У прыватнасці, на думку Бюро прадстаўніка па пытаннях свабоды СМІ АБСЕ, «акрэдытацыя журналістаў прадугледжваецца ў тых выпадках, калі неабходна ўпарадкаваць (а не спыніць) доступ журналістаў да тых ці іншых падзеяў, да пасяджэнняў органаў улады, асабліва калі цікавасць СМІ перавышае фізічныя магчымасці яе задаволіць (гэта значыць, пры адсутнасці належных умоў для адначасовай працы вялікай колькасці прадстаўнікоў прэсы). Акрэдытацыя дазваляе вызначыць тыя СМІ і тых журналістаў, якія

сапраўды спецыялізуюцца на асвятленні дзейнасці дзяржаўнай улады, з мэтай надання ім першачарговага права на атрыманне адпаведнай інфармацыі»[27]. Адсутнасць акрэдытацыі не павінна расцэньвацца як перашкода для ажыццяўлення журналісцкай дзейнасці.

**Забарона на дзейнасць у Беларусі без акрэдытацыі МЗС журналістаў замежных СМІ (у тым ліку беларускіх грамадзян)**
Беларускае заканадаўства аб СМІ забараняе ажыццяўленне прафесійнай дзейнасці журналістаў замежных СМІ на тэрыторыі Беларусі без акрэдытацыі (п. 4 арт. 35 Закона аб СМІ). У адпаведнасці з п. 3 гэтага артыкула акрэдытацыя журналістаў замежных СМІ праводзіцца Міністэрствам замежных спраў Рэспублікі Беларусь у парадку, устаноўленым Саветам Міністраў[28]. У каментары да праекта Закона Рэспублікі Беларусь «Аб сродках масавай інфармацыі» Бюро прадстаўніка АБСЕ па пытаннях свабоды сродкаў масавай інфармацыі ў 2008 годзе выказала занепакоенасць нормамі, якія ўводзяць забарону на прафесійную дзейнасць журналістаў замежных СМІ без спецыяльнай акрэдытацыі ў МЗС, і нагадала, што Беларусь узяла на сябе абавязацельства «палягчаць больш свабоднае і шырокае распаўсюджванне ўсіх формаў інфармацыі, заахвочваць супрацоўніцтва ў галіне інфармацыі і абмен інфармацыяй з іншымі краінамі і паляпшаць умовы, у якіх журналісты з адной дзяржавы-ўдзельніцы ажыццяўляюць сваю прафесійную дзейнасць у іншай дзяржаве-ўдзельніцы»[29].

Бюро прадстаўніка АБСЕ па пытаннях свабоды сродкаў масавай інфармацыі выказала сумнеў у тым, што нормы аб абавязковай акрэдытацыі карэспандэнтаў замежных СМІ «спрыяюць мэце, зафіксаванай у міжнароднай дамове Рэспублікі Беларусь. Заключны акт у Раздзеле 2 – «Інфармацыя» (пункт с) прадугледжвае правы як акрэдытаваных (часова або пастаянна) замежных журналістаў, так і журналістаў іншых дзяржаў без уліку наяўнасці ў іх адмысловай акрэдытацыі. У прыватнасці, дзяржавы-ўдзельніцы, да ліку якіх адносіцца і Беларусь, узялі абавязацельства «павялічваць магчымасці асабістых зносін журналістаў дзяржаў-удзельніц з крыніцамі іх інфармацыі, у тым ліку арганізацыямі і афіцыйнымі ўстановамі».

Між тым з 2014 года гэтая норма заканадаўства стала падставай для пераследу журналістаў-фрылансараў, матэрыялы якіх з'яўляліся ў замежных медыя. Свайго піка ён дасягнуў у 2018 годзе, калі журналісты прыцягваліся да адміністрацыйнай адказнасці за супрацоўніцтва з замежнымі медыя без акрэдытацыі не менш як 118 разоў (што больш, чым за чатыры папярэднія гады, разам узятыя, з моманту, калі такая форма адказнасці стала прымяняцца). Агульная сума штрафаў у 2018 годзе перавысіла 100 тысяч беларускіх рублёў (у пераліку на канец года – 46.300 долараў ЗША)[30].

У 2019 годзе ціск на фрылансараў некалькі знізіўся. Гэта можа быць звязана з Еўрапейскімі гульнямі, што прайшлі ў Мінску, а таксама з выбарамі ў Палату прадстаўнікоў Рэспублікі Беларусі, пазітыўную ацэнку якіх ад міжнародных структур хацелі атрымаць беларускія ўлады. З чэрвеня па верасень 2019 года журналістаў практычна не штрафавалі за супрацоўніцтва з замежнымі медыя. Тым не менш за 2019 год Беларуская асацыяцыя журналістаў зафіксавала 44 выпадкі такіх штрафаў.

Журналістаў, якія супрацоўнічаюць з замежнымі медыя без акрэдытацыі МЗС, суды штрафуюць на падставе пратаколаў, складзеных міліцыяй паводле адвольна трактаванай імі часткі 2 арт. 22.9 Кодэкса аб адміністрацыйных правапарушэннях. Гэты артыкул прадугледжвае адказнасць не за працу без акрэдытацыі, а за незаконны выраб і/або распаўсюджванне прадукцыі СМІ. За шэсць гадоў, з 2014-га па 2019-ты, суды на падставе міліцэйскіх пратаколаў па гэтым артыкуле КоАП штрафавалі журналістаў-фрылансараў у Беларусі ў агульнай складанасці 279 разоў.

Ва ўсіх выпадках падставай для прыцягнення іх да адказнасці стаў не змест матэрыялаў, а сам факт з'яўлення ў замежных медыя. У большасці выпадкаў пераследуюцца журналісты, якія супрацоўнічаюць з тэлеканалам «Белсат», што ўваходзіць у структуру АТ «Польскае тэлебачанне», але пазіцыянуе сябе як першы незалежны тэлеканал Беларусі.

***График 15.*** *Колькасць штрафаў, прызначаных у Беларусі на падставе ч. 2 арт. 22.9 КоАП («Незаконны выраб і распаўсюджванне прадукцыі СМІ»).*
***Крыніца:*** *Беларуская асацыяцыя журналістаў.*








**Пашыральна сфармуляваны пералік інфармацыі, распаўсюджванне якой у СМІ забароненае**

У арт. 38 Закона аб СМІ, які набыў моц у 2009 годзе, прыведзены пералік інфармацыі, распаўсюджванне якой у сродках масавай інфармацыі забароненае. У артыкуле пералічваецца некалькі відаў інфармацыі, забароненай да распаўсюджвання, аднак гэты пералік не выкладзены як вычарпальны, а адносіць да забароненай і «іншую інфармацыю, распаўсюджванне якой забароненае гэтым Законам, іншымі актамі заканадаўства Рэспублікі Беларусь». Больш за тое, у снежні 2014 года ў гэты і без таго малаакрэслены пералік была дададзеная інфармацыя, «распаўсюджванне якой здольнае нанесці шкоду нацыянальным інтарэсам Рэспублікі Беларусь». У 2018 годзе пералік забароненай да распаўсюджвання інфармацыі быў яшчэ больш пашыраны, прычым гэтыя абмежаванні былі распаўсюджаныя і на інтэрнэт-рэсурсы, незалежна ад таго, ці зарэгістраваныя яны ў якасці сеткавых выданняў.

**Абмежаванне фінансавання СМІ з замежных крыніц**

Артыкул 8 Закона аб СМІ забараняе атрымліваць грашовыя сродкі і іншую маёмасць для фінансавання сродкаў масавай інфармацыі ад ананімных крыніц, ад замежных юрыдычных асоб, замежных грамадзян і асоб без грамадзянства, якія пастаянна не пражываюць на тэрыторыі Беларусі. Выключэнне складаюць выпадкі, калі гэтыя асобы ўдзельнічаюць у статутным фондзе юрыдычнай асобы, на якую ўскладзеныя функцыі рэдакцыі сродку масавай інфармацыі. Доля замежных удзельнікаў у статутным фондзе рэдакцыі СМІ, зарэгістраванай як камерцыйная арганізацыя, не павінна перавышаць 20 працэнтаў. У выпадку, калі юрыдычная асоба, на якую ўскладзеныя функцыі рэдакцыі СМІ, з'яўляецца некамерцыйнай арганізацыяй, меншай за 20 працэнтаў павінна быць колькасць замежных удзельнікаў.

Гэтыя палажэнні не распаўсюджваюцца на тыя рэдакцыі СМІ, якія былі зарэгістраваныя да прыняцця Закона аб СМІ, што абмежаваў долю замежных удзельнікаў у статутным фондзе рэдакцый СМІ 30 працэнтамі, і ўнясення зменаў у Закон аб СМІ ў 2014 годзе, калі гэтая доля была зменшаная да 20 працэнтаў, – то бок на найбольш уплывовыя СМІ, сфармаваныя з удзелам расійскага капіталу.

## Магчымасці ўжывання санкцый да медыя

**Шырокія магчымасці Мінінфарма выносіць папярэджанні традыцыйным СМІ і распачынаць справы па спыненні выпуску СМІ**

Міністэрства інфармацыі мае права выносіць пісьмовыя папярэджанні рэдакцыі СМІ і ўладальнікам сеткавых выданняў у выпадку ўчынення дзеянняў, якія супярэчаць патрабаванням Закона аб СМІ (п.п. 1.1. п. 1 арт. 49 Закона аб СМІ). Акрамя гэтай падставы вынясення папярэджання ў законе прыводзяцца яшчэ чатыры, якія, аднак, пасля першага падпункта, што ахоплівае ўсе віды парушэнняў, выглядаюць залішнімі.

Пісьмовыя папярэджанні могуць стаць падставамі для спынення выпуску СМІ. Выпуск СМІ ў Беларусі можа быць спынены рашэннем суда па іску Міністэрства інфармацыі альбо пракурора (п. 1 арт. 51 Закона аб

СМІ). Прычым закон дапускае магчымасць прад'яўлення іску аб спыненні выпуску СМІ нават у выпадку аднаразовага парушэння яго палажэнняў. Гэта датычыць выпадкаў парушэння парадку распаўсюджвання прадукцыі замежнымі сродкамі масавай інфармацыі, афіцыйных інфармацыйных паведамленняў і (або) матэрыялаў, прадукцыі эратычнага характару, а таксама парадку ажыццяўлення тэле- і радыёвяшчання.

Але, мабыць, найбольшую пагрозу для медыя ўяўляе палажэнне Закона аб СМІ (п.п. 2.2. п. 2 арт. 51), у адпаведнасці з якім Міністэрства інфармацыі можа звярнуцца ў суд з іскам аб спыненні выпуску сродку масавай інфармацыі ў выпадку вынясення рэдакцыі або заснавальніку СМІ на працягу года двух і больш пісьмовых папярэджанняў. Прычым такі іск можа быць прад'яўлены незалежна ад цяжару парушэнняў, дапушчаных рэдакцыяй або журналістам: дастаткова факту вынясення двух папярэджанняў з любых нагодаў, нават самых фармальных і дробных.





Іск аб спыненні выпуску сродку масавай інфармацыі можа прад'явіць і пракурор, калі службовым асобам рэдакцыі альбо заснавальніку СМІ на працягу года былі вынесеныя два і больш афіцыйныя папярэджанні пракурора. Закон аб СМІ не ўстанаўлівае, пракурор якога ўзроўню можа выносіць такія папярэджанні і звяртацца ў суд з іскам аб спыненні выпуску СМІ.

Варта адзначыць, што апошнімі гадамі ні Міністэрства інфармацыі, ні пракуроры гэтымі сваімі паўнамоцтвамі не карысталіся.

## Рэгуляванне дзейнасці анлайн-медыя

Першы нарматыўны прававы акт, спецыяльна прысвечаны прававому рэгуляванню адносінаў у інтэрнэце, быў прыняты ў Беларусі ў 2010 годзе – Указ прэзідэнта № 60 «Аб мерах па ўдасканаленні выкарыстання нацыянальнага сегмента сеткі Інтэрнэт»[31].

Важную ролю ва ўзмацненні жорсткасці дзяржаўнага кантролю над інтэрнэт-сферай сыгралі змены ў Закон аб СМІ, унесеныя ў 2014 і 2018 гадах. Так, у снежні 2014 года Закон аб СМІ быў дапоўнены арт. 51-1 «Абмежаванне доступу да прадукцыі сродкаў масавай інфармацыі, якая распаўсюджваецца з дапамогай інфармацыйнага рэсурсу (яго складовай часткі), размешчанага ў глабальнай камп'ютарнай сетцы Інтэрнэт» (у 2018 годзе ён быў выкладзены ў новай рэдакцыі).

Насуперак сцвярджэнням афіцыйных асобаў пра тое, што інтэрнэт-рэсурсы могуць быць заблакаваныя пасля вынясення ўладальніку рэсурсу на працягу года двух і больш пісьмовых папярэджанняў, закон прадугледжвае і іншыя падставы для абмежавання доступу да сайтаў.  А менавіта:

- распаўсюджванне інтэрнэт-рэсурсам паведамленняў і матэрыялаў, забароненых або абмежаваных да распаўсюджвання законамі Беларусі, а таксама рашэннямі суда, што набылі законную моц;
- невыкананне ўладальнікам інтэрнэт-рэсурсу законнага патрабавання дзяржаўнага органа аб ліквідацыі парушэнняў заканадаўства Рэспублікі Беларусь аб сродках масавай інфармацыі.

З гэтага вынікае, што:

- Блакавацца могуць не толькі інтэрнэт-рэсурсы беларускага сегмента інтэрнэту, але і сайты, якія знаходзяцца за яго межамі.
- Блакаванне магчымае нават за аднаразовае парушэнне патрабаванняў закона (на думку Мініінфарма).
- Блакаванне ажыццяўляецца па рашэнні Міністэрства інфармацыі ў пазасудовым парадку (да 2018 года закон нават не прадугледжваў магчымасці судовага абскарджання гэтага рашэння).

Спіс абмежаванага доступу фарміруецца на падставе рашэнняў Міністэрства інфармацыі – альбо з уласнай ініцыятывы міністэрства, альбо на падставе рашэнняў суда, што набылі законную моц, альбо на падставе пісьмовых апавяшчэнняў дзяржаўных органаў і арганізацый,

якія выявілі ў межах сваёй кампетэнцыі факты распаўсюджвання інтэрнэт-рэсурсамі інфармацыі, забароненай да распаўсюджвання. Пры гэтым, як паказвае практыка, Мініфарм не правярае законнасць гэтых пісьмовых апавяшчэнняў.

14 снежня 2017 года Міністэрства інфармацыі прыняло рашэнне аб блакаванні сайта belaruspartisan.org («Беларускі партызан»). Праз месяц, 24 студзеня 2018 года, быў абмежаваны доступ да яшчэ аднаго папулярнага інтэрнэт-рэсурсу – charter97.org («Хартыя'97»).

У выпадку з «Беларускім партызанам» Мініфарм абгрунтаваў сваё рашэнне «вынікамі маніторынгу гэтага рэсурсу, які выявіў сістэматычнае парушэнне заканадаўства аб сродках масавай інфармацыі». «На згаданым інфармацыйным рэсурсе, размешчаным за межамі нацыянальнага сегмента сеткі Інтэрнэт, рэгулярна размяшчаюцца матэрыялы, у якіх змяшчаецца забароненая інфармацыя», – гаварылася ў заяве міністэрства[32].



У выпадку з сайтам «Хартыя'97» Мініфарм адзначыў у якасці прычыны для блакавання "матэрыялы, што змяшчаюць інфармацыю, распаўсюджванне якой здольнае нанесці шкоду нацыянальным інтарэсам Рэспублікі Беларусь, <...> артыкулы з указаннем даты і месца правядзення масавага мерапрыемства, дазвол на правядзенне якога на момант размяшчэння публікацыі атрыманы не быў, <...> распаўсюджванне з дапамогай сайта charter97.org інфармацыйнай прадукцыі рэсурсу, які рашэннем суда прызнаны экстрэмісцкім матэрыялам і ўнесены ў рэспубліканскі спіс экстрэмісцкіх матэрыялаў»[33].

У абодвух выпадках рашэнні абмежаваць доступ да сайтаў прымаліся непразрыста, у пазасудовым парадку, без паведамлення, якія менавіта матэрыялы сталі падставай для блакавання[34].

Дзяржаўны кантроль над інтэрнэт-прасторай у Беларусі быў істотна ўзмоцнены ў выніку зменаў, унесеных у заканадаўства аб СМІ ў 2018 годзе[35].

Акрамя змены парадку абмежавання доступу да інтэрнэт-рэсурсаў яны прадугледзелі, у прыватнасці:

- магчымасць добраахвотнай рэгістрацыі інтэрнэт-рэсурсаў у якасці СМІ, пры гэтым быў захаваны складаны дазвольны парадак гэтай рэгістрацыі; інтэрнэт-рэсурсы, якія не праходзяць рэгістрацыю, не маюць правоў СМІ, а іх карэспандэнты – журналісцкага статусу;

- дадатковыя падставы для абмежавання доступу да інтэрнэт-рэсурсаў (напрыклад, выкарыстанне інтэрнэт-рэсурсу для забароненай законамі Беларусі дзейнасці);

- абавязак інтэрнэт-рэсурсаў ідэнтыфікаваць аўтараў каментароў на сваіх старонках і форумах, а таксама праводзіць мадэрацыю іх каментароў пад пагрозай адказнасці за іх[36].

Новыя нормы ўсталявалі таксама дадатковую адказнасць уладальнікаў інтэрнэт-рэсурсаў (арт. 22.9 Кодэкса аб адміністрацыйных правапарушэннях «Парушэнне заканадаўства аб СМІ»).
За распаўсюджванне «забароненай» інфармацыі ўсталёўваецца штраф. Яго максімальны памер для сайтаў, зарэгістраваных у якасці сеткавых выданняў, складае 200 базавых велічынь (у 2020 годзе гэта 5.400 BYN), а для інтэрнэт-рэсурсаў, якія не маюць такога статусу, – 100 базавых велічынь (2.700 BYN). Пры гэтым пералік забароненай інфармацыі і падыходы да яе вызначэння ў заканадаўстве адсутнічаюць. Кантроль за выкананнем заканадаўства аб СМІ ў гэтай сферы ўскладаецца на супрацоўнікаў міліцыі.

Са спробамі дзяржавы ўзмацніць кантроль над беларускім сегментам інтэрнэту можна звязаць і павелічэнне нацiску на блогераў (крымінальныя справы ў дачыненні да Сяргея Пятрухіна і Андрэя Павука)[37], і так званую справу БелТА, якая стала самай гучнай крымінальнай справай у дачыненні да журналістаў у Беларусі за апошнія гады.

4 сакавіка 2019 года суд Заводскага раёна Мінска прызнаў галоўнага рэдактара вядучага беларускага інтэрнэт-партала tut.by Марыну Золатаву вінаватай у бяздзейнасці службовай асобы (арт. 425 Крымінальнага кодэкса) і прыгаварыў яе да штрафу ў 7.650 беларускіх рублёў (каля 3.600 долараў ЗША). Акрамя таго, суд спагнаў з яе на карысць дзяржаўнага інфармацыйнага агенцтва БелТА працэсуальныя выдаткі ў памеры 6.000 рублёў (каля 2.800 долараў ЗША).

Гэты прысуд паставіў кропку ў «справе БелТА»[38], распачатай летам 2018 года. Нагодай для яе распачынання паслужыла несанкцыянаванае выкарыстанне некаторымі журналістамі пароляў да падпісной стужкі сайта БелТА.

Пры гэтым матэрыялы сайта БелТА знаходзіліся ў адкрытым бясплатным доступе і размяшчаліся медыя, якія трапілі пад уціск, з улікам правіл, устаноўленых БелТА, а паролі да падпісной стужкі не змяняліся гадамі. 7–9 жніўня 2018 года ў рэдакцыях інфармацыйнай кампаніі БелаПАН, партала tut.by, рэдакцыях некаторых іншых медыя, а таксама ў кватэрах шэрагу іх супрацоўнікаў прайшлі вобшукі. Падчас іх былі канфіскаваныя прафесійная тэхніка і носьбіты інфармацыі. Каля 20 журналістаў былі затрыманыя і дапытаныя следчымі, 8 – адпраўленыя ў ізалятар часовага ўтрымання на тэрмін да трох сутак. У дачыненні да 15 журналістаў былі распачатыя крымінальныя справы на падставе ч. 2 арт. 349 Крымінальнага кодэкса (несанкцыянаваны доступ да камп'ютарнай інфармацыі, выкананы з карыслівай ці іншай асабістай зацікаўленасці).

Дзеянні следчых выклікалі пратэсты з боку праваабаронцаў, журналісцкіх арганізацый і міжнародных структур (у тым ліку Савета Еўропы, Еўрасаюза, АБСЕ). У канцы 2018 года крымінальныя справы ў дачыненні да 14 журналістаў былі спыненыя з прыцягненнем іх да адміністрацыйнай адказнасці ў выглядзе буйных штрафаў і фактычным прымусам да выплаты кампенсацый БелТА і газеце Адміністрацыі прэзідэнта «СБ. Беларусь сегодня».

Адзінай абвінавачванай, прыцягнутай па «справе БелТА» да крымінальнай адказнасці, стала Марына Золатава.

«Прысуд і штраф Марыне Золатавай, галоўнаму рэдактару tut.by, разам з непрапарцыйнымі мерамі праваахоўных органаў супраць БелаПАН і tut.by у 2018 годзе могуць мець негатыўнае ўздзеянне на незалежныя СМІ ў Беларусі», – адзначыў прадстаўнік АБСЕ па пытаннях свабоды СМІ Арлем Дэзір[39].

Міжнародная арганізацыя «Рэпарцёры без межаў» назвала прысуд Марыне Золатавай «актам запалохвання ў дачыненні да незалежных медыя ў Беларусі». «Тое, як беларускія ўлады настойліва займаліся гэтай справай з самага пачатку, паказвае іх рашучасць падарваць канкурэнтаў дзяржаўных СМІ», – заявіў кіраўнік бюро арганізацыі па Усходняй Еўропе і Цэнтральнай Азіі Ёхан Бір[40].

## Крымінальнае заканадаўства аб дыфамацыі

У Крымінальным кодэксе Беларусі маецца шэсць артыкулаў, якія ўсталёўваюць адказнасць за дыфамацыю:

- 188 «Паклёп»,
- 189 «Абраза»,
- 367 «Паклёп у дачыненні да Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь»,
- 368 «Абраза Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь»,
- 369 «Абраза прадстаўніка ўлады»,
- 391 «Абраза суддзі або засядальніка».

Акрамя таго, арт. 369-1 прадугледжвае адказнасць за дыскрэдытацыю Рэспублікі Беларусь.

Артыкулы 188 і 189 усталёўваюць крымінальную адказнасць за паклёп і абразу, учыненыя на працягу года пасля накладання мер адміністрацыйнага спагнання за такія ж дзеянні. Да крымінальнай адказнасці па гэтых артыкулах можна таксама прыцягнуць за паклёп альбо знявагу ў публічным выступе, творы, сродках масавай інфармацыі.

Менавіта па гэтых двух артыкулах быў абвінавачаны брэсцкі блогер Сяргей Пятрухін. 18 красавіка 2019 года суд Ленінскага раёна Брэста прызнаў яго вінаватым у паклёпе і абразе супрацоўнікаў міліцыі. Суд прыгаварыў Пятрухіна да штрафу ў 9.180 BYN (што на той момант было эквівалентна прыблізна 4.400 доларам ЗША), а таксама абавязаў яго выплаціць у якасці кампенсацыі маральнай шкоды супрацоўнікам міліцыі ў агульнай складанасці 7.500 рублёў (каля 3.600 долараў ЗША)[41]. Падставай для прыцягнення блогера да крымінальнай адказнасці сталі відэаролікі, якія былі знятыя ў сакавіку 2018 года і трансляваліся на YouTube. У гэтых роліках Сяргей Пятрухін заявіў пра дачыненне шэрагу супрацоўнікаў міліцыі да збіцця чалавека ў міліцэйскім участку пасля таго, як пацярпелы грамадзянін звярнуўся ў праваахоўныя органы з патрабаваннем расследавання інцыдэнту і распавёў пра гэта блогеру.

Перад пачаткам судовага працэсу 14 беларускіх праваабарончых арганізацый выступілі з патрабаваннем спыніць крымінальны пераслед Сяргея Пятрухіна. На іх думку, ён меў палітычна матываваны характар і звязаны выключна з рэалізацыяй блогерам гарантаваных Канстытуцыяй і міжнароднымі нормамі правоў у галіне свабоды выказвання меркавання, збору і распаўсюджвання інфармацыі[42].

Артыкулы Крымінальнага кодэкса 367 «Паклёп у дачыненні да Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь» (максімальная санкцыя – да 5 гадоў пазбаўлення волі) і 368 «Абраза Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь» раней прымяняліся да журналістаў. У 2002 годзе на падставе гэтых артыкулаў былі асуджаныя галоўны рэдактар гродзенскай газеты «Пагоня» Мікола Маркевіч і яе карэспандэнт Павел Мажэйка, а таксама галоўны рэдактар газеты «Рабочы» Віктар Івашкевіч. У 2011 годзе за паклёп у дачыненні да прэзідэнта краіны быў асуджаны гродзенскі журналіст Андрэй Пачобут, у дачыненні да якога на падставе гэтага ж артыкула была распачатая крымінальная справа і ў 2013 годзе.

Апошнім часам фактаў крымінальных спраў, распачатых на падставе гэтых артыкулаў, не было, аднак яны застаюцца ў Крымінальным кодэксе, нягледзячы на рэкамендацыі міжнародных арганізацый.

«Дзяржавам-удзельніцам варта разгледзець магчымасць выключэння паклёпу з разраду злачынстваў, але ў любым выпадку крымінальнае заканадаўства павінна прымяняцца толькі ў сувязі з найбольш сур'ёзнымі выпадкамі, а пазбаўленне волі ні пры якіх умовах не павінна лічыцца адэкватнай мерай пакарання, – адзначаецца ў Каментары агульнага парадку № 34, прынятым Камітэтам па правах чалавека ААН да артыкула 19 Міжнароднага пакта аб грамадзянскіх і палітычных правах. – Дзяржава-ўдзельніца не павінна дапускаць сітуацый, калі пасля выстаўлення асобе абвінавачвання ў паклёпе судовы разбор у дачыненні да гэтай асобы не праводзіцца найхутчэйшым чынам, бо такая практыка мае ўздзеянне скоўвання, яно неправамерна абмяжоўвае ажыццяўленне такой асобай або іншымі асобамі права на свабоднае выказванне меркавання».

## Выкарыстанне заканадаўства аб супрацьдзеянні экстрэмізму для ціску на медыя, журналістаў і блогераў

Закон Рэспублікі Беларусь «Аб супрацьдзеянні экстрэмізму» набыў моц у пачатку 2007 года[43]. Артыкул 14 гэтага закона забараняе выданне і распаўсюджванне, у тым ліку праз сродкі масавай інфармацыі, «экстрэмісцкіх матэрыялаў».

Магчымасць шырокага выкарыстання гэтага закона для абмежавання свабоды слова першапачаткова закладзеная ў яго тэксце. Азначэнні, дадзеныя ў законе тэрмінам «экстрэмісцкая дзейнасць» і «экстрэмісцкія матэрыялы», няпэўныя і расплывістыя. На іх падставе магчыма прызнаваць экстрэмісцкімі ледзь не любыя крытычныя матэрыялы, што нярэдка і адбывалася на практыцы.

Прымяненне Закона «Аб супрацьдзеянні экстрэмізму» ў дачыненні да медыя пачалося неўзабаве пасля яго прыняцця. «Экстрэмісцкімі» прызнаваліся многія інфармацыйныя матэрыялы, якія супрацоўнікі міліцыі і мытні затрымлівалі ў грамадзян пры правозе за мяжу.

У прыватнасці, гэта былі дыскі з запісамі канцэртаў і фільмаў (2008 год), фотаальбом «Прэс-фота Беларусі 2011» (2013 года).

У жніўні 2014 года ў Беларусі была створаная Рэспубліканская экспертная камісія па ацэнцы інфармацыйнай прадукцыі на прадмет наяўнасці (адсутнасці) у ёй прыкмет праявы экстрэмізму, якая атрымала своеасаблівую манаполію на выяўленне «экстрэмізму» ў краіне. Акрамя таго, створаныя адпаведныя абласныя камісіі.

Рэспубліканская камісія пачала дзейнічаць са студзеня 2015 года пры Мініінфарме. У снежні 2016 года рашэнне камісіі аб наяўнасці прыкмет экстрэмізму ў артыкулах трох беларускіх аўтараў, якія публікаваліся ў расійскіх СМІ – Юрыя Паўлаўца, Дзмітрыя Алімкіна і Сяргея Шыпценкі (так званая справа рэгнумаўцаў – па назве расійскага інфармацыйнага агенцтва, якое публікавала іх артыкулы), паслужыла падставай для распачынання ў дачыненні да іх справы на падставе арт. 130 Крымінальнага Кодэкса Рэспублікі Беларусь «Распальванне расавай, нацыянальнай, рэлігійнай альбо іншай сацыяльнай варожасці» і ўзяцця іх пад варту. 2 лютага 2018 года Мінскі гарадскі суд прызнаў іх вінаватымі і прызначыў пакаранне ў выглядзе пяці гадоў пазбаўлення волі з адтэрміноўкай выканання пакарання на тры гады. Асуджаныя былі вызваленыя ў зале суда.

Раней, у жніўні 2016 года, суд прызнаў экстрэмісцкімі дзевяць артыкулаў, апублікаваных на сайце 1863x.com блогера Эдуарда Пальчыса. 28 кастрычніка 2016 года Мінскі гарадскі суд прыгаварыў Пальчыса да 1 года і 9 месяцаў абмежавання волі без накіравання ў папраўчую ўстанову. Эдуард Пальчыс быў вызвалены ў зале суда ў сувязі з залікам часу яго знаходжання пад вартай да вынясення прысуду.

Апошнім часам павялічылася колькасць выпадкаў прыцягнення журналістаў і актывістаў да адміністрацыйнай адказнасці за публікацыі ў сацыяльных сетках. Падставай для гэтага называецца арт. 17.11. Кодэкса аб адміністрацыйных правапарушэннях. Ён усталёўвае адказнасць за распаўсюджванне інфармацыйнай прадукцыі, якая змяшчае заклікі да экстрэмісцкай дзейнасці ці прапагандуе такую дзейнасць.

Так, журналіст-фрылансар Аляксандр Дзянісаў быў аштрафаваны на 612,5 BYN за рэпост двух відэа пра ўдзел брэсцкіх анархістаў у акцыі пратэсту 2017 года «Марш дармаедаў»[44].

У канцы 2018 года Аляксандр Горбач[45] і Мікалай Дзядок[46] былі аштрафаваныя за размяшчэнне ў сацсетках ілюстрацый з сімваламі, прызнанымі экстрэмісцкімі, хаця ў сваіх пастах яны крытыкавалі праявы неанацызму.

Падрабязны аналіз выкарыстання «антыэкстрэмісцкага» заканадаўства для ўшчамлення свабоды выказвання меркавання ўтрымліваецца ў сумесным аналітычным дакладзе праваабарончых арганізацый Беларусі «Супрацьдзеянне экстрэмізму і правы чалавека. Нацыянальнае антыэкстрэмісцкае заканадаўства і правапрымяняльная практыка». Даклад таксама ўтрымлівае канкрэтныя рэкамендацыі праваабаронцаў па змене заканадаўства па супрацьдзеянні экстрэмізму і практыкі яго прымянення ў Беларусі[47].



## Заканадаўства аб медыя і практыка яго прымянення: рэкамендацыі

Неабходна адзначыць, што большасць рэкамендацый, прапанаваных у аналітычным дакладзе «За рэформы медыя ў Беларусі» (2014), так і не былі выкананыя. Мэтай гэтых рэкамендацый з'яўляецца ўзмацненне свабоды выказвання меркаванняў у Беларусі, а таксама прывядзенне заканадаўства краіны ў адпаведнасць з міжнароднымі абавязацельствамі Рэспублікі Беларусь у гэтай сферы.

У дакладзе ўтрымліваюцца рэкамендацыі  па змене Закона «Аб сродках масавай інфармацыі»:

- Галоўным прынцыпам рэгулявання журналістыкі павінна стаць незалежная самарэгуляцыя; журналісты любых медыя, традыцыйных і анлайн, уключаючы фрылансараў, павінны мець роўныя правы для сваёй прафесійнай дзейнасці.

- Працэдура рэгістрацыі СМІ павінна быць максімальна спрошчаная, выконвацца ў паведамляльным парадку і выключаць любыя штучныя абмежаванні для ўваходу на рынак СМІ.

- Варта выключыць магчымасць спынення дзейнасці СМІ ў пазасудовым парадку; Міністэрства інфармацыі не павінна мець паўнамоцтваў па ўжыванні санкцый у дачыненні да сродкаў масавай інфармацыі (уключаючы ініцыяванне спраў аб закрыцці СМІ на падставе вынесеных ім папярэджанняў).

Шэсць артыкулаў Крымінальнага кодэкса Беларусі павінны быць адмененыя:

- Артыкул 188 «Паклёп»;
- Артыкул 189 «Абраза»;
- Артыкул 367 «Паклёп у дачыненні да Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь»;
- Артыкул 368 «Абраза Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь» ;
- Артыкул 369 «Абраза прадстаўніка ўлады»;
- Артыкул 369–1 «Дыскрэдытацыя Рэспублікі Беларусь».

Роўны і поўны доступ да значнай для грамадства інфармацыі павінен быць забяспечаны для ўсіх журналістаў любых медыя. Інстытут акрэдытацыі не павінен прымяняцца для абмежавання доступу да інфармацыі. Існуючая забарона на супрацоўніцтва з замежнымі СМІ без акрэдытацыі мусіць быць ліквідаваная, бо супярэчыць Канстытуцыі Беларусі і яе міжнародным абавязацельствам у галіне свабоды выказвання.

# ІНФАРМАЦЫЙНАЯ БЯСПЕКА БЕЛАРУСІ Ў МЕДЫЙНАЙ СФЕРЫ

Праблема інфармацыйнай бяспекі Беларусі апынулася ў цэнтры ўвагі пасля 2014 года. Пасля анексіі Крыма Расійскай Федэрацыяй і пачатку ўзброенага канфлікту ва Украіне рэзка ўзрасла колькасць недакладнай інфармацыі, якая распаўсюджваецца расійскімі медыя. У гэтай сувязі з'явіліся асцярогі наконт верагоднасці распаўсюджвання тэхналогій «гібрыднай вайны» і на Беларусь.

У прыватнасці, яны былі агучаныя ў дакладзе «Мадэрнізацыя медыйнага заканадаўства Рэспублікі Беларусь у сферы абароны нацыянальнай інфармацыйнай прасторы»[48].

«Сацыялагічныя даследаванні паказваюць, што большасць грамадзян Беларусі не ў стане крытычна ўспрымаць інфармацыю, якую распаўсюджваюць СМІ, і падзяляюць расійскую пазіцыю па гэтым пытанні. Так, у адпаведнасці з вынікамі сацыялагічных апытанняў, каля 60% рэспандэнтаў, адказваючы на пытанне аб далучэнні Крыма да Расіі, пагадзіліся з расійскім мэсэджам («гэта вяртанне Расіі рускіх зямель, аднаўленне гістарычнай справядлівасці»). Між тым афіцыйная пазіцыя беларускіх уладаў адносна Крыма і падзей ва Украіне іншая. Але беларускія дзяржаўныя СМІ, якія дамінуюць у інфармацыйнай прасторы краіны, не змаглі данесці гэтую пазіцыю да сваёй аўдыторыі і растлумачыць яе», – адзначалі аўтары даклада.

У выніку праведзенага даследавання былі зробленыя, у прыватнасці, наступныя высновы:

- Абсалютная большасць міжнародных пагадненняў у сферы нацыянальнай бяспекі, у тым ліку інфармацыйнай, Беларусь заключыла з дзяржавамі, якія ўваходзяць у СНД. Таму еўрапейскія механізмы супрацьдзеяння распальванню нянавісці, распаўсюджванню іншай інфармацыі, забароненай у адпаведнасці з міжнароднымі стандартамі, не выкарыстоўваюцца ў Беларусі, бо яна не ўдзельнічае ў адпаведных міжнародных пагадненнях.
- Меры па абароне інфармацыйнай прасторы краіны не ўплываюць на працу буйных расійскіх медыя, але «выціскаюць» з яе медыя іншых краін, якія маглі б даць беларускай аўдыторыі альтэрнатыўны погляд на тое, што адбываецца ў свеце.

Развіццю незалежных беларускіх медыя, якія таксама маглі б стаць супрацьвагай расійскім СМІ, перашкаджаюць як жорсткае заканадаўства краіны ў сферы выказвання меркавання, так і даволі слабы медыярынак і залішняе дзяржаўнае рэгуляванне эканамічных працэсаў.

У Беларусі абмяжоўваецца доступ аўдыторыі да кантэнту, які разглядаецца ўладамі як непажаданы. Пры гэтым многія абмежавальныя механізмы не адпавядаюць абавязацельствам Рэспублікі Беларусь у галіне свабоды выказвання меркавання. Яны могуць быць выкарыстаныя для абароны нацыянальных інтарэсаў краіны ад знешніх пагроз, але пакуль прымяняюцца пераважна для абмежавання магчымасці прыхільнікаў дэмакратычных пераменаў данесці сваё бачанне сітуацыі да масавай аўдыторыі.

Небяспека знешняй інфармацыйнай пагрозы з боку асноўных стратэгічных партнёраў Беларусі практычна не разглядаецца.

Пры гэтым расійская прапаганда ў Беларусі распаўсюджваецца большай часткай не непасрэдна расійскімі тэлеканаламі, а юрыдычна беларускімі, якія ўключаныя ў абавязковы агульнадаступны пакет тэлепраграм, зацверджаны ўрадам Беларусі, і абавязковыя для распаўсюджвання ўсімі вяшчальнікамі і кабельнымі аператарамі[49].

## Прарасійская прапаганда на беларускім тэлебачанні

Апошняя выснова пацвярджаецца маніторынгамі прарасійскай прапаганды і рыторыкі паглыбленай інтэграцыі, якія правяла Беларуская асацыяцыя журналістаў у 2018[50] і 2019[51] гадах.

У перыяд даследавання чатыры з васьмі тэлеканалаў, якія ўваходзяць у абавязковы агульнадаступны пакет (спартыўны канал «Беларусь 5» не даследаваўся), дэманстравалі ў прайм-тайм больш за 60% прадукцыі расійскай вытворчасці. Калі дадаць фільмы і серыялы расійскай вытворчасці, то сумарны час прысутнасці расійскай тэлепрадукцыі ў беларускім тэлеэфіры аказваецца яшчэ большым.

Украпванні кантэнту, выробленага не ў Расіі і не ў Беларусі, у эфірную сетку застаюцца нязначнымі і дасягаюцца ў асноўным за кошт трансляцыі мастацкіх фільмаў. Перадачы ўкраінскай вытворчасці, якія з'явіліся ў беларускім тэлеэфіры, у пераважнай большасці – забаўляльныя.





Агульны характар матэрыялаў, прысвечаных беларуска-расійскім адносінам, быў унутрана супярэчлівым – ад парадных сюжэтаў пра братэрства народаў, агульную гісторыю, агульную мову, агульных ворагаў да крытыкі паводзінаў уладаў Расійскай Федэрацыі ў адносінах да Беларусі. З узрастаннем напружанасці ў адносінах паміж Беларуссю і Расіяй у эканамічнай сферы суверэнная рыторыка стала прыкметна больш жорсткай.

Пры гэтым у беларускім эфіры па-ранейшаму дамінаваў «рускі свет» – ад агульнай расійскацэнтрычнай карціны свету да прэвалявання расійскага забаўляльнага кантэнту. Такім чынам, беларуская аўдыторыя сістэмна і рэгулярна атрымлівае пераважна расійскі медыйны парадак дня і пракрамлёўскі погляд на асноўныя падзеі ў свеце, у тым ліку з дзяржаўнага тэлебачання, што фінансуецца з бюджэту. Меры, што прымаюцца беларускімі ўладамі для абароны інфармацыйнай прасторы краіны, па-ранейшаму ўяўляюцца не адэкватнымі рэальным пагрозам.

## Змены ў антыбеларускай дэзынфармацыі і прапагандзе

З 2016 па 2018 гады адбыліся сур'ёзныя змены ў спосабах распаўсюджвання расійскай дэзынфармацыі і прапаганды ў Беларусі. Іх адзначае ў сваім даследаванні Андрэй Елісееў (East Center и iSANS)[52]:

«У сферы дэзынфармацыі і прапаганды ў дачыненні да Беларусі ў інтэрнэт-прасторы адбыліся кардынальныя перамены. З часу «справы Рэгнума», звязанай з крымінальным пераследам трох публіцыстаў, якія размяшчалі на шэрагу расійскіх анлайн-рэсурсаў аўтарскія матэрыялы адносна Беларусі з выкарыстаннем мовы варожасці, гэтая з'ява не толькі не зменшылася ў маштабах, але значна развілася як у колькасных, так і ў якасных адносінах».

Даследаванне, у прыватнасці, выявіла каля 40 інтэрнэт-рэсурсаў, якія на рэгулярнай аснове размяшчаюць публікацыі пра Беларусь, што ўтрымліваюць дэзынфармацыю і прапагандысцкія наратывы, а часам выкарыстоўваюць і мову варожасці. Якасна новай з'явай стала з'яўленне цэлага шэрагу новых актыўных крыніц дэзынфармацыі, якія цалкам прысвечаныя падзеям у Беларусі. Раней асноўнымі крыніцамі дэзынфармацыі выступалі расійскія сайты з шырокай інфармацыйнай праблематыкай, якія толькі часткова факусаваліся на Беларусі.

Паводле дадзеных даследавання, у 2018 годзе пачала актыўную дзейнасць паўнавартасная каардынаваная сетка рэгіянальных сайтаў з рэгулярнымі публікацыямі, якія змяшчаюць мову варожасці ў дачыненні да розных сацыяльных, палітычных, рэлігійных, прафесійных груп насельніцтва Беларусі. Сайты гэтай рэгіянальнай сеткі дэзынфармацыі выкарыстоўваюць вонкава нейтральнае афармленне і камбінуюць рэгіянальны навінавы, пазнавальны і забаўляльны кантэнт, узяты з іншых першакрыніц, з уласным агрэсіўным шавіністычным кантэнтам. Гэтыя асаблівасці дазваляюць выкарыстоўваць стратэгію «траянскага каня», калі ўвага чытачоў да мэтавых матэрыялаў прыцягваецца з дапамогай падавання разнастайнага нейтральнага кантэнту. Сайты рэгіянальнай сеткі дэзынфармацыі

актыўна абменьваюцца кантэнтам з іншымі крыніцамі дэзынфармацыі і прапагандысцкіх наратываў па Беларусі. За большай часткай рэгіянальнай сеткі дэзынфармацыі стаіць расійская арганізацыя CIS-EMO, што служыла парасоністай арганізацыяй «міжнародных назіральнікаў» на рэферэндуме 2014 года ў Крыме, які папярэднічаў анексіі паўвострава Расійскай Федэрацыяй.

## Дзеянні ўладаў па абароне інфармацыйнай прасторы Беларусі

На фоне «гібрыднай вайны» ва Украіне беларускія ўлады сталі надаваць больш увагі абароне інфармацыйнай прасторы краіны.

Акрамя ўжо згаданай вышэй «справы рэгнумаўцаў» (гл. раздзел «Выкарыстанне заканадаўства аб супрацьдзеянні экстрэмізму для націску на медыя, журналістаў і блогераў» гэтага даклада) варта зазначыць унясенне некаторых зменаў у Закон аб СМІ і прыняцце Канцэпцыі аб інфармацыйнай бяспецы Рэспублікі Беларусь[53].

Закон аб СМІ ў рэдакцыі 2018 года ў прыватнасці прадугледжвае:

- абавязковую рэгістрацыю ў Беларусі замежных СМІ, што распаўсюджваюць на тэрыторыі Беларусі сваю прадукцыю са змяненнем формы або зместу;
- атрыманне дазволу на распаўсюджванне на тэрыторыі Беларусі прадукцыі замежнага СМІ без змянення формы і зместу (у тым ліку на рэтрансляцыю замежных тэлеканалаў у кабельных сетках);
- забарону на фінансаванне СМІ з замежных крыніц (за выключэннем выпадкаў удзелу іх у статутным фондзе рэдакцыі з доляй замежных інвестыцый да 20 працэнтаў);
- устанаўленне 30-працэнтнага мінімуму тэлеперадач, аўдыявізуальных твораў, іншых паведамленняў і матэрыялаў беларускай вытворчасці ў штомесячным аб'ёме вяшчання тэлевізійных сродкаў масавай інфармацыі.

Аднак правілы замежнага фінансавання СМІ не распаўсюджваюцца на тыя з іх, якія зарэгістраваныя да ўваходжання зменаў у заканадаўства ў сілу (гэта значыць, у большасці сваёй на найбольш папулярныя медыя, заснаваныя на расійскай прадукцыі, і расійскія франшызы). А для дасягнення ўстаноўленага аб'ёму перадач і матэрыялаў беларускай вытворчасці законам было адведзена два гады, усталяваны ж законам аб'ём беларускіх тэле- і радыёперадач уяўляецца відавочна недастатковым.

18 сакавіка 2019 года Савет бяспекі Беларусі зацвердзіў Канцэпцыю інфармацыйнай бяспекі Рэспублікі Беларусь. Найважнейшай мэтавай установкай забеспячэння інфармацыйнай бяспекі ў дакуменце названы «інфармацыйны суверэнітэт Рэспублікі Беларусь».

Асноўнымі крыніцамі пагроз інфармацыйна-псіхалагічнага характару ў інфармацыйнай сферы для Беларусі ў Канцэпцыі вызначаныя інфармацыйнае супрацьборства паміж вядучымі сусветнымі цэнтрамі сілы і мэтанакіраванае фарміраванне ўнутры і за межамі краіны інфармацыйных падстаў для дыскрэдытацыі дзяржаўнай знешняй і ўнутранай палітыкі.

«У прыярытэтным парадку неабходна падтрымліваць захаванне ў грамадстве традыцыйных сацыяльных асноў і каштоўнасцяў, адкрытае і ўсебаковае інфармацыйнае забеспячэнне і суправаджэнне дзяржаўнай палітыкі, а таксама перашкаджанне ў законным парадку распаўсюджванню незаконнай і недакладнай масавай інфармацыі», – адзначаецца ў Канцэпцыі.

У ёй таксама з'явілася згадка пра ролю беларускай мовы як гаранта гуманітарнай бяспекі дзяржавы (хай і са згадкай «канстытуцыйна замацаванага ў дзяржаве двухмоўя»).

Аднак прынцыповай змены падыходаў да абароны інфармацыйнай прасторы не адбылося. Канцэпцыя інфармацыйнай бяспекі распрацаваная ў рамках Канцэпцыі нацыянальнай бяспекі, якая валодае большай юрыдычнай сілай, і не можа за іх выходзіць.
Гэта пацвярджае і той факт, што літаральна праз два тыдні пасля зацвярджэння Канцэпцыі інфармацыйнай бяспекі Саветам бяспекі,

1 красавіка 2019 года, набыло моц Пагадненне аб супрацоўніцтве дзяржаў – членаў Арганізацыі Дагавора аб калектыўнай бяспецы ў галіне забеспячэння інфармацыйнай бяспекі. Гэты дакумент расстаўляе зусім іншыя прыярытэты і не разглядае магчымыя пагрозы інфармацыйнай бяспецы Беларусі з боку «стратэгічных саюзнікаў».

Разам з тым улады Беларусі выказваюць яўную занепакоенасць уплывам расійскіх медыя. Гэта стала відавочным пасля нарады прэзідэнта Лукашэнкі з кіраўнікамі найбуйнейшых дзяржаўных медыя краіны ў лютым 2020 года.

«І гэтае права [праводзіць уласную інфармацыйную палітыку] мы як суверэнная і незалежная дзяржава павінны адстойваць, што б там ні было, у тым ліку на інфармацыйным полі», – адзначыў Лукашэнка падчас нарады[54].

Ужо праз некалькі дзён пасля нарады галоўны рэдактар газеты Адміністрацыі прэзідэнта «СБ. Беларусь сегодня» Дзмітрый Жук у тэлеперадачы «Клуб рэдактараў» на тэлеканале «Беларусь 1» адкрыта заявіў: «Тая рыторыка нянавісці, якая на расійскіх СМІ прысутнічае ў дачыненні да Украіны, у любы момант можа перакінуцца і на нас»[55].



## Першачарговыя меры па абароне інфармацыйнай прасторы Беларусі ў медыйнай сферы. Рэкамендацыі

Асноўныя рэкамендацыі ў гэтай сферы былі падрыхтаваныя групай экспертаў у рамках даследавання «Мадэрнізацыя медыйнага заканадаўства Рэспублікі Беларусь у сферы абароны нацыянальнай інфармацыйнай прасторы».

Яны, у прыватнасці, уключалі ў сябе наступныя прапановы:

- перагледзець Канцэпцыю нацыянальнай бяспекі Рэспублікі Беларусь з улікам новых выклікаў і пагроз;

- забяспечыць для дзяржаўных і недзяржаўных медыя роўныя ўмовы для доступу да бюджэтнага фінансавання на конкурснай аснове, дзяржаўных сістэмаў распаўсюджвання, размеркавання частотнага рэсурсу, атрымання ліцэнзій;
- правесці адкрыты конкурс па вызначэнні тэлепраграм, уключаных у абавязковы агульнадаступны пакет тэлепраграм, дапусціць у тэлевізійны эфір замежныя тэлеканалы (у тым ліку на беларускай, украінскай і рускай мовах), змест якіх адпавядае Еўрапейскай канвенцыі аб трансгранічным вяшчанні і якія маглі б ураўнаважыць уплыў расійскіх тэлепраграм у беларускай медыяпрасторы;
- заахвочваць развіццё беларускамоўнага інфармацыйнага вяшчання;
- заахвочваць дэманстрацыю замежнай аўдыявізуальнай прадукцыі на мове арыгіналу з беларускімі субцітрамі.

Варта зазначыць, што некаторыя меры, прадугледжаныя ў даследаванні, беларускія ўлады рэалізавалі. У прыватнасці, былі зняты дыскрымінацыйныя абмежаванні па доступе недзяржаўных друкаваных медыя да дзяржаўных сістэм распаўсюджвання («Белпошта» і «Белсаюздрук»); механізм прыняцця рашэння аб унясенні інтэрнэт-рэсурсаў у спіс абмежаванага доступу стаў больш празрыстым, цяпер прадугледжаная магчымасць абскардзіць такія рашэнні ў судзе.

Аднак у цэлым заканадаўства і практыкі ў сферы абароны інфармацыйнай прасторы Беларусі па-ранейшаму не адпавядаюць сённяшнім выклікам.

## Ініцыятыва па лакалізацыі глабальных інтэрнэт-сэрвісаў

У якасці пазітыўнага прыкладу дзеянняў прафесійнай супольнасці ў падтрымку інфармацыйнай бяспекі краіны і развіцця беларускага медыярынку можна прывесці дэкларацыю «Пра неабходнасць геаграфічнай лакалізацыі інтэрнэт-сэрвісаў і прызнання інтэрнэт-сегмента

Беларусі асобным рынкам»[56]. Яна ставіць за мэту дамагчыся ад глабальных інтэрнэт-карпарацый прызнання Беларусі як асобнага рынку і геаграфічна лакалізаваць іх сэрвісы для жыхароў Беларусі.

«Апошнімі гадамі аднымі з самых прыкметных прадуктаў глабальных інтэрнэт-карпарацый сталі рэкамендацыйныя навінавыя сэрвісы. Запуск навінавых рэкамендацыйных агрэгатараў істотна паўплываў на медыйны рынак Беларусі.

Зараз карпарацыі не ўлічваюць краінавыя асаблівасці і часцяком ігнаруюць неабходнасць геаграфічнай прывязкі кантэнту па краіне яго стварэння. Адсутнасць паўнавартаснага геатаргетынгу ставіць у няроўныя ўмовы журналісцкія рэдакцыі ў Беларусі ў параўнанні з тым, як працуюць іх калегі ў Расіі, Украіне, Літве, Латвіі і Польшчы. Інтэрнэт-карпарацыі не вылучаюць Беларусь як самастойную краіну і вызначаюць беларускіх карыстальнікаў у абагульнены рускамоўны сектар альбо толькі часткова лакалізуюць кантэнт. Гэта аслабляе ўнутраны медыйны рынак і перашкаджае яго паўнавартаснаму развіццю. Ігнараванне інтэрнэт-карпарацыямі неабходнасці лакалізаваць сэрвісы для Беларусі супярэчыць Канцэпцыі інфармацыйнай бяспекі, зацверджанай у сакавіку 2019 года. Гэта наўпрост уздзейнічае на інфармацыйную сферу Беларусі і парушае інфармацыйны суверэнітэт нашай краіны», – гаворыцца ў тэксце дэкларацыі.

Дакумент падпісалі кіраўнікі найбуйнейшых анлайн-медыя ў Беларусі і шэраг медыяэкспертаў. Кааліцыя выказала намер выступіць са зваротам да Google, Yandex, Mail.ru, Opera, Microsoft, Apple і іншых карпарацый з патрабаваннем улічваць патрэбы беларускага рынку і распачаць усе магчымыя дзеянні па вырашэнні праблемы.

Гэтыя звароты ўключаюць у сябе дзве прапановы:

- Вылучыць Беларусь як асобны рэгіён спажывання навінавага і іншага інфармацыйнага кантэнту, у тым ліку адасобіць беларускі парадак дня ад навін суседніх рускамоўных краін.
- Даць беларускім медыя прыярытэт у ранжыраванні крыніц інфармацыі ў рэкамендацыйных сістэмах для карыстальнікаў, якія выбралі рэгіён Беларусь як асноўны.

# СПАСЫЛКІ


1. За рэформы медыя ў Беларусі: аналітычны даклад пра свабоду СМІ ў Беларуси, 2014:
https://baj.by/sites/default/files/analytics/files/belarus_media_freedom_by_web.pdf

2. Freedom in the World:
https://freedomhouse.org/countries/freedom-world/scores

3. 2019 World Press Freedom Index, Reporters without Borders:
https://rsf.org/en/ranking/2019#

4. Положение в области прав человека в Беларуси: доклад специального докладчика по вопросу о положении в области прав человека в Беларуси Анаис Марэн:
https://documents-dds-ny.un.org/doc/UNDOC/GEN/N19/223/86/PDF/N1922386.pdf?OpenElement

5. «Практика наказания журналистов без аккредитации в Беларуси вредит свободе СМИ, заявил Представитель ОБСЕ по вопросам свободы СМИ»:
https://www.osce.org/ru/representative-on-freedom-of-media/380386

6. Республика Беларусь в зеркале социологии: сборник материалов социологических исследований / Информационно-аналитический центр при Администрации Президента Республики Беларусь. – Минск: 2018

7. Обзор наиболее популярных программ и сериалов, показанных на белорусских каналах в январе – апреле
2018 года, «АМГ-Консалт»:
http://amg-consult.by/publication/program_review/

8. Open Neighbourhood – Communicating for a stronger partnership: connecting with citizens across the Eastern Neighbourhood. Annual survey report: Belarus:
https://euneighbours.eu/sites/default/files/publications/2019-07/EUNEIGHBOURS%20east_AS2019report_BELARUS.pdf

9. Республика Беларусь в зеркале социологии: сборник материалов социологических исследований / Информационно-аналитический центр при Администрации Президента Республики Беларусь. – Минск: 2018.

10. Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Звесткі аб сродках масавай інфармацыі на 1 сакавіка 2020 года:
http://mininform.gov.by/by/activities/statystyka-galiny/

11. Закон Рэспублікі Беларусь № 269-З ад 16 снежня 2019 года «Аб рэспубліканскім бюджэце на 2020 год»:
http://minfin.gov.by/upload/bp/act/zakon_161219_269z.pdf

12. «Белсат. Ціск уладаў»:
https://belsat.eu/about/tsisk-uladau

13. «Обыск в «Белсате». Дверь хотели пилить болгаркой, вынесли всю технику». Захар Щербаков, Naviny.by:
https://naviny.by/article/20190409/1554794819-obysk-v-belsate-sotrudniki-mchs-hoteli-bolgarkoy-spilit-dveri-v-ofise

14. «Лукашенко поручил создать телеканал по типу Euronews», Naviny.by:
https://naviny.by/new/20200211/1581430429-lukashenko-poruchil-sozdat-telekanal-po-tipu-euronews

15. «Разьвітаньне з радыёхвалямі», «Радыё Свабода»:
https://www.svaboda.org/p/7152.html

16. Сайт Асацыяцыі выдаўцоў рэгіянальнай прэсы:
http://masmedyi.by/about

17. «Независимые газеты возвращаются в киоски и подписку», Naviny.by:
https://naviny.by/article/20170322/1490177192-nezavisimye-gazety-vozvrashchayutsya-v-kioski-i-podpisku

18. Информационное общество в Республике Беларусь: статистический сборник. Национальный статистический комитет Республики Беларусь, 2019:
https://www.belstat.gov.by/upload/iblock/fac/facac4a309c011aab5f9ed856bd3da49.pdf

19. Социальные сети в Беларуси, Brand Analytics:
https://br-analytics.ru/blog/belarus-october-2019

20. Digital 2020: Belarus, We Are Social, Hootsuite:
https://datareportal.com/reports/digital-2020-belarus

21. Оценка пользования мессенджерами в Беларуси:
http://www.infopolicy.biz/?p=11830

22. Нарада з кіраўнікамі вядучых дзяржаўных СМІ. Афіцыйны сайт прэзідэнта Беларусі:
http://president.gov.by/by/news_by/view/narada-z-kiraunikami-vjaduchyx-dzjarzhaunyx-srodkau-masavaj-infarmatsyi-23019

23. Статистика Telegram-каналов, Беларусь:
https://by.tgstat.com

24. «Рынок интернет-рекламы Беларуси: две победы и одна угроза», Ксенія Іванова, даклад на канферэнцыі «Дзелавы інтэрнэт»:
https://www.youtube.com/watch?v=o_vEFTBO15M

25. «Дзяржаўныя тэлеканалы адыходзяць ад пасрэднікаў пры продажы рэкламнага часу», БелТА:
https://blr.belta.by/society/view/dzjarzhaunyja-telekanaly-adyhodzjats-ad-pasrednikau-pry-prodazhy-reklamnaga-chasu-81127-2019

26. Маніторынг Media IQ:
http://mediaiq.by/monitoring

27. Комментарий к проекту Закона Республики Беларусь «О средствах массовой информации», Организация по безопасности и сотрудничеству в Европе, Бюро представителя по вопросам свободы СМИ, 2008 год: http://www.osce.org/ru/

28. Положение о порядке аккредитации в Республике Беларусь журналистов иностранных средств массовой информации утверждено постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 25 декабря 2008 г. № 2015: http://mfa.gov.by/upload/vv/post_2015_accreditation.pdf fom/32600?download=true

29. Заключительный акт Совещания по безопасности и сотрудничеству в Европе: http://www.osce.org/documents/mcs/1975/08/4044_ru.pdf

30. «Штрафы журналістам па арт. 22.9 КоАП», БАЖ: https://baj.by/be/analytics/shtrafy-zhurnalistam-pa-art-229-kaap-tablica-abnaulyaecca

31. Указ Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь № 60 ад 1 лютага 2010 года «Аб мерах па ўдасканаленні выкарыстання нацыянальнага сегмента сеткі Інтэрнэт»: http://pravo.by/document/?guid=3871&p0=P31000060

32. «14 декабря 2017 г. принято решение об ограничении доступа к интернет-ресурсу belaruspartisan.org», Министерство информации Республики Беларусь: http://mininform.gov.by/news/all/14-dekabrya-2017-g-prinyato-reshenie-ob-ogranichenii-dostupa-k-internet-resursu-belaruspartisan-org/?sphrase_id=29552

33. «Доступ к интернет-ресурсу charter97.org ограничен за распространение запрещенной информации», Министерство информации Республики Беларусь: http://mininform.gov.by/news/all/dostup-k-internet-resursu-charter97-org-ogranichen-za-rasprostranenie-zapreschennoy-informacii/?sphrase_id=29551

34. «ГА «Беларуская асацыяцыя журналістаў» пратэстуе супраць блакіроўкі грамадска-палітычных сайтаў», БАЖ: https://baj.by/be/analytics/ga-belaruskaya-asacyyacyya-zhurnalistau-pratestue-suprac-blakirouki-gramadska-palitychnyh

35. Закон Рэспублікі Беларусь ад 17 ліпеня 2018 года № 128-З «Аб унясенні зменаў і дапаўненняў у некаторыя законы Рэспублікі Беларусь»: http://mininform.gov.by/upload/iblock/8dc/8dca9553743c798b828f2f980aa15248.pdf

36. «Поправки в Закон о СМИ: регистрация интернет-изданий, идентификация комментаторов, блокировка соцсетей», БАЖ: https://baj.by/be/content/popravki-v-zakon-o-smi-registraciya-internet-izdaniy-identifikaciya-kommentatorov-blokirovka

37. СМІ ў Беларусі: электронны бюлетэнь, студзень–чэрвень, 2019, БАЖ: https://baj.by/be/analytics/masmedyya-u-belarusi-no258-studzen-cherven-2019-g

38. Naviny.by: «Дело БелТА» https://naviny.by/plot/delo-belta

39. «Арлем Дэзір: Прысуд Золатавай можа негатыўна паўплываць на незалежныя СМІ ў Беларусі», БАЖ:
https://baj.by/be/content/arlem-dezir-prysud-zolatavay-mozha-negatyuna-pauplyvac-na-nezalezhnyya-smi-u-belarusi

40. «“Репортеры без границ”: штраф Золотовой – попытка запугать оставшиеся независимые СМИ Беларуси», tut.by:
https://news.tut.by/economics/628655.html

41. «В Бресте вынесен приговор блогеру Сергею Петрухину», «Брестская газета»:
https://www.b-g.by/news/v-breste-vyinesen-prigovor-blogeru-sergeyu-petruhinu-video/

42. «Патрабуем неадкладна спыніць крымінальны пераслед у дачыненні да блогера Сяргея Пятрухіна». Супольная заява праваабаронччых і іншых арганізацый грамадзянскай супольнасці:
https://baj.by/be/content/patrabuem-neadkladna-spynic-kryminalny-perasled-u-dachynenni-da-blogera-syargeya-pyatruhina

43. Закон Рэспублікі Беларусь № 203-З ад 4 студзеня 2007 года «Аб супрацьдзеянні экстрэмізму»:
http://www.pravo.by/document/?guid=3871&p0=H10700203

44. «Музыканта оштрафовали за репост видео из запрещенной группы «ВКонтакте», которая не была заблокирована», tut.by:
https://news.tut.by/society/614047.html

45. «Справа аб экстрэмізме: Гэта нонсэнс – абвінавачваць антыфашыста ў выкарыстанні нацысцкай атрыбутыкі», БАЖ: https://baj.by/be/content/sprava-ab-ekstremizme-geta-nonsens-abvinavachvac-antyfashysta-u-vykarystanni-nacysckay

46. «Асуджэнне нацызму – пад забаронай?». Анастасія Рубанава, «Новы час»: https://novychas.by/hramadstva/sudny-dzen

47. http://spring96.org/files/book/ru/2019_extremism_ru.pdf

48. Модернизация медийного законодательства Республики Беларусь в сфере защиты национального информационного пространства, BISS: https://belinstitute.com/sites/biss.newmediahost.info/files/attached-files/BISS_SA05_2016ru.pdf

49. Пастанова Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь № 407 ад 13 мая 2015 года «Аб зацвярджэнні пераліку тэлепраграм, якія ўваходзяць у абавязковы агульнадаступны пакет тэлепраграм, і вызначэнні паслядоўнасці (чарговасці) іх распаўсюджвання»:
http://pravo.by/upload/docs/op/C21500407_1431723600.pdf

50. «Продвижение «русского мира» идет через белорусские ТВ-каналы – БАЖ презентовал мониторинг пророссийской пропаганды», БАЖ:
https://baj.by/be/analytics/prodvizhenie-russkogo-mira-idet-cherez-belorusskie-tv-kanaly-bazh-prezentoval-monitoring

51. «Мониторинг БАЖ «Пророссийская пропаганда и освещение «углубленной

интеграции» на белорусском телевидении», БАЖ:
https://baj.by/be/analytics/monitoring-bazh-prorossiyskaya-propaganda-i-osveshchenie-uglublennoy-integracii-na

52. Кардинальные перемены в антибелорусской дезинформации и пропаганде: анализ количественных и качественных изменений, Андрей Елисеев, East Center, iSANS:
http://east-center.org/wp-content/uploads/2019/04/Belarus-Disinformation-Propaganda-2019-RU.pdf

53. http://mininform.gov.by/upload/medialibrary/6f8/6f80a36dcb2aac3bcaa330cda20ae733.pdf

54. «Лукашенко взялся модернизировать свою пропагандистскую машину», Павлюк Быковский, Naviny.by:
https://naviny.by/article/20200219/1582092736-lukashenko-vzyalsya-za-modernizaciyu-svoey-propagandistskoy-mashiny

55. «Клуб рэдактараў», тэлеканал «Беларусь 1», 14 лютага 2020 года: https://www.youtube.com/watch?v=dua8_cu9Z-8 56 https://press-club.by/dosved/deklaraciya-o-neobhodimosti-geograficheskoy-lokalizacii-internet-servisov-i-priznaniya

56. https://press-club.by/dosved/deklaraciya-o-neobhodimosti-geograficheskoy-lokalizacii-internet-servisov-i-priznaniya

Даклад створаны пры падтрымцы Амбасады Вялікабрытаніі ў Мінску.

Аўтары выказваюць падзяку Паўлюку Быкоўскаму,
Ірыне Віданавай, Міхаілу Дарашэвічу, Кірылу Лашчанку,
Галіне Малішэўскай і грамадскаму аб'яднанню
«Беларуская асацыяцыя журналістаў», а таксама беларускім
медыяэкспертам, рэдактарам і журналістам, без працы якіх стварэнне
гэтага даклада было б немагчымым.





«Медыя ў Беларусі 2020. Рынак, законы і інфармацыйная бяспека».
Аналітычны даклад

Аўтары: Андрэй Аляксандраў і Андрэй Бастунец.
Дызайн і вёрстка: Ірына Злобіна.

**МЕДЫЯ Ў БЕЛАРУСІ 2020**
**Мінск / 2020**